Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛЮТАГА 2017 г. СЕРАДА № 31 (28395)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Памятаем пайменна

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў вайны ў Афганістане з нагоды Дня памяці.

«У Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў прыміце словы шчырай удзячнасці за доблесць, стойкасць і мужнасць, праяўленыя вамі ў гарачых кропках планеты. Мы памятаем пайменна і смуткуем аб сынах Беларусі, якія цаной уласнага жыцця пацвердзілі вернасць прысязе і воінскаму абавязку, схіляем галовы перад іх бацькамі, удовамі і дзецьмі», — адзначаецца ў звароце.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што толькі праз гады прыйшло сапраўднае разуменне значнасці тых, ужо далёкіх падзей. «У сучаснай гісторыі вы былі першымі, хто даў рашучы адпор міжнароднаму тэрарызму», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння воіны-інтэрнацыяналісты па-ранейшаму займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, добрасумленна працуюць на карысць роднай Беларусі. Дзякуй, што вы поруч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны працягваеце годна выхоўваць маладое пакаленне ў духу сапраўднага патрыятызму», — падкрэсліў Прэзідэнт.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў

«Старшынства ў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве мае асаблівае значэнне для Беларусі. Як вядома, наша краіна заўсёды займала лідзіруючыя пазіцыі ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы, стоячы каля вытокаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Саюзнай дзяржавы, а таксама Еўразійскага эканамічнага саюза. Нягледзячы на тое, што не ўсе нашыя чаканні спраўдзіліся, мы застаёмся актыўнымі прыхільнікамі больш цеснай інтэграцыі ў рэгіёне ў імя нашага агульнага дабра».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 15.02.2017 г.

Долар ЗША	1,8804 ▼
Еўра	1,9956 ▼
Рас. руб.	0,0325 ■
Укр. грыўня	0,0691 ▼

ISSN 1990 - 763X

■ 15 лютага — Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГАНАРОВАЯ ВАРТА

Вучні малодшых класаў сярэдняй школы вёскі Ленін Жыткавіцкага раёна каля мемарыяльнай дошкі з партрэтамі воінаў-землякоў Юрыя ГОРБАТА, Канстанціна МІХАЙЛОЎСКАГА і Івана ХАЦЯНОВІЧА, якія загінулі на афганскай зямлі.

ЗВЫЧАЙНАЯ АРМЕЙСКАЯ РАБОТА: 2 ГАДЫ, 2 МЕСЯЦЫ, 16 ДЗЁН

Як былы афіцэр-дэсантнік стаў вучоным-матэматыкам

У загадчыка кафедры вышэйшай матэматыкі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта нават падчас студэнцкіх канікулаў няма адноснага зацішша: сесія завочнікаў, процьма арганізацыйных пытанняў, а яшчэ некалькі калег грыпуюць, даводзіцца тэрмінова знаходзіць падмену. Таму ўсё робіцца хутка, дакладна, без мітусні. Вайсковая жылка нікуды не дзелася. Хоць ваенную службу Леанід МАХНІСТ пакінуў ужо чвэрць стагоддзя таму.

Леанід Пятровіч працуе на кафедры без малога 20 гадоў, з якіх восем кіруе ёй. За плячыма — абарона дысертацыі і больш за 150 навуковых і метадычных прац. А колькі студэнтаў прайшло праз яго рукі! У тэхнічнай ВНУ практычна ўсе матэматыку вывучаюць чатыры семестры — гэта адзін з галоўных прадметаў. Навуковая работа і работа з моладдзю цяпер сталі асноўным зместам жыцця былога афіцэра-дэсантніка.

Не, ён не рыхтаваў сябе да ваеннай службы і, здаецца, не асабліва марыў аб кар'еры вайскоўца. Хлопчык з Глыбокага Віцебскай вобласці пайшоў у школу ў шэсць гадоў. Рана навучыўся чытаць, пісаць, лічыць, а маці была настаўніцай, узяла і адправіла сына ў школу раней. А ў 16 гадоў Леанід стаў студэнтам мехмата БДУ. Пасля ўніверсітэта мог бы пайсці супрацоўнікам у які-небудзь даследчы інстытут ці ўладкавацца на прэстыжнае прадпрыемства. Але, паводле яго слоў, савецкага хлопца прыцягвала рамантыка вайсковага жыцця, яго марай было паслужыць у дэсантнай часці. Відаць, на гэта паўплывала біяграфія бацькі, франтавіка. Пётр Махніст на вайне служыў у пал-

кавой разведцы. СТАР. 4

■ Сацыяльны клопат

АБ РЫНКУ ПРАЦЫ, ПЕНСІЯХ І ДАПАМОГАХ

Рэструктурызацыя прадпрыемстваў павінна быць сацыяльна адказнай

На выніковай калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, акрамя падвядзення вынікаў работы ў 2016 годзе, былі намечаны планы на гэты год. У адным з мінулых нумароў мы ўжо пісалі пра тое, якой будзе палітыка міністэрства ў сферы аплаты працы. Сёння гаворка пойдзе аб рынку працы, пенсіях і сацпадтрымцы.

ПЛАНУЕЦЦА СТВАРЫЦЬ 70 ТЫСЯЧ ДАДАТКОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

Асаблівая ўвага была ўдзелена захаванню стабільнай сітуацыі на рынку працы ў краіне. «Не павінна быць пустых размоў пра тое, што аптымізацыя — гэта аўтаматычнае скарачэнне», — адзначыў, у прыватнасці, **віцэ-прэм'ер Васіль ЖАРКО.**

Між тым праведзеная ў краіне кадравая дыягностыка выявіла залішнюю колькасць працуючых у арганізацыях Беларусі на ўзроўні амаль 6%. І, як заявіў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ,** працэс рэструктурызацыі цягне за сабой вызваленне часткі работнікаў. «Да аптымізацыі трэба падыходзіць абдумана, — сказаў Андрэй Лабовіч. — Яна павінна быць сацыяльна адказнай. Там, дзе гэта трэба, мэтазгодна прыцягваць да вырашэння праблемы і ўлады, і бізнес, і прафсаюзы».

СТАР. 3

БІЗНЕС: СВАБОДА ЦІ АДКАЗНАСЦЬ?

Прэзідэнт правёў нараду па ўдасканаленні працы кантрольных органаў

Бізнес для большасці ўвасабляе перш за ўсё незалежнасць, магчымасць усё вырашаць самастойна. Ну і, натуральна, шмат грошай, новыя машыны і іншыя матэрыяльныя асалоды ад жыцця. Але гэта — толькі адзін бок медаля. Іншы — ненармаваны графік працы, неабходнасць своечасова вярнуць банку крэдыт, адказнасць за людзей, якія працуюць на тваім прадпрыемстве, эканамічныя рызыкі... Як правіла, сваю справу могуць годна развіваць менавіта тыя людзі, якія арыентуюцца на другі — трошкі менш прывабны, але нашмат больш рэалістычны сцэнарый. Вялікае значэнне яны маюць і для дзяржавы.

Калі ёсць жаданне, усё магчыма

Учора **Прэзідэнт краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА** правёў нараду з членамі рабочай групы па пытаннях удасканалення кантрольнай дзейнасці і выключэння лішніх патрабаванняў для бізнесу. Акцэнты — на перагляд сутнасці працэдур кантролю, выкараненне абсурдных патрабаванняў і нарматываў для бізнесу і на наладжванне адкрытага дыялогу прадпрымальнікаў і дзяржавы. А самае галоўнае, на разняволенне дзелавой ініцыятывы.

— Мы сталі не проста прапаведаваць, але і развіваць новую эканоміку. Што цалкам падтрымліваю, прызнаю і на што заўсёды хацеў бы рабіць упор: гэта эканоміка павінна ў дзелавым плане разняволіць чалавека, — сказаў Прэзідэнт.

Заўсёды актуальная простая ісціна: калі нечага сапраўды хочаш, то абавязкова зможаш гэтага дасягнуць. Тое ж самае і ў бізнесе. Калі чалавек прыходзіць туды з сур'ёзнымі намерамі і цалкам усведамляе адказнасць, свае пэўныя абавязкі, у першую чаргу, перад тымі, хто прыйдзе працаваць у яго фірму, то і справа стане паспяховай. Для нашай эканомікі такі бізнес вельмі выгадны: гэта гарантыя дабрабыту людзей, іх стабільнай і належнай зарплаты.

Без татальнага кантролю

Розныя праверкі павінны быць зведзены да мінімуму — адно з асноўных патрабаванняў Прэзідэнта. Уся адказнасць — на кіраўніку, і адказваць, калі што, будзе ён. Тады кіраўнік будзе сам зацікаўлены ў тым, каб на вытворчасці ўсё было ў парадку.

— Кожны працоўны дзень у краіне адбываецца каля чатырохсот пяцідзесяці розных праверак, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. *— Я разумею гэтую лічбу. Электрык прыйшоў паглядзеў на лічыльнік — гэта таксама праверка. Таму тут не трэба груба падыходзіць.*

У той жа час здараецца, што з запланавымі візітамі кантралёры наведваюць буйныя прадпрыемствы да паўсотні і болей разоў на год.

— Думаю, што хопіць захапляцца татальным кантролем, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Настаў час пераглядзець саму сутнасць кантролю. Асноўны акцэнт тут трэба ставіць на канчатковы вынік, а не на праверку дзеля яе самой. Калі прадпрыемства працуе, плаціць падаткі і на яго няма ніякіх скаргаў, то не трэба перашкаджаць людзям займацца справай. Гэта ключавое патрабаванне кіраўніка дзяржавы.

Неабходна перагледзець і падыходы да назначэння праверак. План іх правядзення фарміруецца Камітэтам дзяржаўнага кантролю на кожны каляндарны год.

— Але хіба ён выконваецца? — задаўся пытаннем Прэзідэнт. *— Толькі ў 2016 годзе доля праведзеных па-за планам мерапрыемстваў склала амаль 80% ад агульнай колькасці па краіне. У гэтай сувязі нагадаю кіраўнікам, што давалі такія распараджэнні: калі законы сапраўды не выконваюцца, значыць, вы неэфектыўна займаецеся прафілактыкай іх парушэнняў.*

Планавыя праверкі, па словах Прэзідэнта, таксама падлягаюць скарачэнню:

— Толькі летась іх праведзена каля пяцідзесяці тысяч. Іншымі словамі, кожны восьмы суб'ект гаспадарання. Гэта вельмі шмат. Асабліва для нашай невялікай дзяржавы.

Акрамя гэтага, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што кантрольныя функцыі не павінны здзяйсняцца камерцыйнымі арганізацыямі. Гэта — прэрагатыва дзяржавы.

Зачараванае кола: знайсці выйсце

Тэма праверак прадпрымальнікаў узнімалася падчас вялікай размовы з Прэзідэнтам, што адбылася ў пачатку месяца. Тады Аляксандр Лукашэнка прапанаваў перагледзець гэту сістэму ў бок скарачэння кантрольных мерапрыемстваў.

Асобна кіраўнік дзяржавы падчас учарашняй нарады выказаўся за спрашчэнне патрабаванняў да вядзення бізнесу:

— Размова ідзе пра ліцэнзаванне, але ў першую чаргу пра адміністрацыйныя працэдуры, якіх у нас сёння вельмі шмат — мне кажуць, каля дзевяцісот. Пры гэтым для адкрыцця нават невялікага кафэ іх патрабуецца каля дванаццаці. На гэта, па самых сціплых падліках, ідзе паўгода. Толькі ўдумайцеся — паўгода! Любы чалавек проста махне рукой...

Неабходна перагледзець увесь масіў патрабаванняў да суб'ектаў гаспадарання, якія часам увогуле нерэальна выканаць. Агульная колькасць прынятых у краіне тэхнічных актаў — больш за шэсць з паловай тысяч. З іх больш за 500 з'яўляюцца абавязковымі. Некаторыя патрабаванні даходзяць да абсурду, калі затраты на іх выкананне перавышаюць даходы ад самой дзейнасці:

— Што да некаторых нормаў, то ўвогуле незразумелая логіка. Узяць, напрыклад, патрабаванні да вышыні памяшканняў аб'ектаў харчавання. Ад падлогі па столі яна павінна быць не менш за тры метры. Чаму не 2,80? Не тры с паловай? Зразумела, у сучасных гарадскіх збудаваннях гэта, тэарэтычна, магчыма. А як быць з будынкамі мінулых стагоддзяў? Атрымліваецца, што ў некаторых з іх нельга будзе адкрыць кафэ і здзівіць там замежнікаў нацыянальнай кухняй у гістарычным або нейкім іншым антуражы. Як быццам у кожнага з вас на кухні столь вышынёй тры з лішнім метры! Ніхто не атруціўся, усе жывыя і здаровыя, кормяць там дзяцей.

Краіна імкнецца паказаць сваю гасціннасць, падпісаны Указ аб адмене віз — для прыцягнення замежных гасцей, не першы год развіваецца аграгурызм, Беларусь прэзентуецца замежным турыстам. Але ўсім гэтым намаганням можа перашкодзіць... недастатковая вышыня столі.

Таму, відаць, не дзіўна, што ключавое патрабаванне — вельмі лаканічнае: не трэба нічога ўскладняць. Простыя патрабаванні лягчэй выконваць, іх зможа без юрыдычнай дапамогі зразумець любы індывідуальны прадпрымальнік.

Яшчэ адно патрабаванне кіраўніка дзяржавы: частка ўстаноўленых правілаў павінна быць максімальна спрошчана або адменена. Санітарныя нормы прызначаны ахоўваць здароўе людзей і папярэджваць узнікненне інфекцыйных захворванняў — і не больш за тое.

Яшчэ раз пра кантакты

Падчас нарады Прэзідэнт звярнуўся да прадстаўнікоў дзелавых колаў, якія таксама прымалі ў ёй удзел. Паколькі менавіта бізнесменам падчас працы даводзіцца непасрэдна сутыкацца з мноствам патрабаванняў і шэрагам праверак, кіраўнік дзяржавы заклікаў усіх да максімальна адкрытага дыялогу ў групе:

— Расказвайце аб існуючых праблемах, уносьце канструктыўныя прапановы і — самае галоўнае — нічога не бойцеся. Ніякага ціску і прэсінгу з боку кантрольных і іншых структур не будзе. Гэта я вам як кіраўнік дзяржавы абяцаю.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Больш як 3 тысячы гадоў турмы могуць атрымаць тыя, хто меў дачыненне да тэракта ў аэрапорце Стамбула

Абвінавачаныя ў дачыненні да тэракта ў стамбульскім аэрапорце 28 чэрвеня 2016 года могуць атрымаць у сукупнасці больш за 3,3 тысячы гадоў турмы. Як паведамляе агенцтва Анадолу, такіх прысудаў патрабуе пракуратура, якая завяршыла падрыхтоўку абвінаваўчага заключэння.



Па справе праходзіць 45 чалавек, з якіх 41 на час следства знаходзіўся пад вартай. Абвінаваўчае заключэнне налічвае 257 старонак. Для большасці абвінавачаных улады патрабуюць па 46 пажыццёвых тэрмінаў у турмах асаблівага рэжыму. Падследных абвінавачваюць у «спробе звяржэння канстытуцыйнага ладу», «наўмысным забойстве», «у стварэнні і членстве ў тэрарыстычнай арганізацыі», а таксама ў нанясенні шкоды прыватнай і дзяржаўнай уласнасці.

У адпаведнасці з крымінальным кодэксам Турцыі тэрмін прысудаў за ўсе гэтыя злачынствы можа скласці ад 2132 да 3342 гадоў турмы. Канчатковы вердыкт будзе вынесены ў ходзе далейшага разгляду.

СМІ: брат Кім Чэн Ына забіты ў малайзійскім аэрапорце атручанымі іголкамі

Кім Чэн Нам, старэйшы брат лідара КНДР Кім Чэн Ына, забіты ў адным з аэрапортаў Малайзіі.

З такім сцвярджэннем выступіла агенцтва Yonhap, спаслаўшыся на неназваныя крыніцы і не прывёўшы падрабязнасцяў. У сваю чаргу, паўднёвакарэйскі кабельны тэлеканал Chosun, спасылаючыся на неназваную ўрадавую крыніцу, сцвярджае, што Кім Чэн Нам быў забіты ў малайзійскім аэрапорце ў выніку нападу на яго дзвюх невядомых жанчын з атручанымі іголкамі. Па звестках тэлеканала, падазраваным удалося ўцячы.

Кім Чэн Нам — старэйшы сын былога кіраўніка КНДР Кім Чэн Іра. Ён доўгі час пражываў за мяжой, у прыватнасці ў Макаа.

Дзярждума мае намер забараніць недарэчныя імёны

Камітэт Дзярждумы па дзяржбудаўніцтве і заканадаўстве падтрымаў канцэпцыю законапраекта сенатара Валянціны Пятрэнкі, які абмяжоўвае права бацькоў даваць дзецям недарэчныя імёны накшталт нецэнзурных і тых, якія складаюцца з лічбаў.

Як расказала член камітэта Ірына Бялых, праект пакуль не рэкамендаваны да першага чытання і патрабуе правак да паняцця імя і крытэрыяў, па якіх яно будзе ацэньвацца. Законапраект быў унесены ў мінулым скліканні Дзярждумы, аднак да разгляду дайшоў толькі цяпер.

У тэксце законапраекта падкрэсліваецца, што ён закліканы не абмежаваць права бацькоў у магчымасці выбраць імя для дзіцяці, а «знайсці баланс паміж правам дзіцяці і бацькоў».

■ Дэкрэт №3

НА ПРАМОЙ СУВЯЗІ

З улікам узросшай колькасці зваротаў грамадзян па пытаннях рэалізацыі норм Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» Кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Н.І. Качанавай прынята рашэнне аб правядзенні кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта, памочнікамі Прэзідэнта — галоўнымі інспектарамі ў рэгіёнах, а таксама начальнікамі асноўных структурных падраздзяленняў Адміністрацыі Прэзідэнта выязных прыёмаў грамадзян у рай- і гарвыканкамах, адміністрацыях раёнаў у гарадах.

Прыёмы пройдуць 16—17 і 23—24 лютага 2017 г. па наступным графіку:

ГРАФІК ПРЫЁМУ ГРАМАДЗЯН КІРАЎНІЦТВАМ І СЛУЖБОВЫМІ АСОБАМІ АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ п\п	Прозвішча, імя, імя па бацьку службовай асобы	Месца прыёму	Час
16 лютага 2017 г.			
1.	Качанава Наталля Іванаўна — Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта	Жодзінскі гарвыканкам	12:00 — 17:00
2.	Пазняк Аляксандр Рыгоравіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Віцебскай вобласці	адміністрацыя Першамайскага раёна г. Віцебска	09:00 — 12:00
3.	Якабсон Аляксандр Серафімавіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па г. Мінску	адміністрацыя Маскоўскага раёна г. Мінска	10:00 — 13:00
4.	Барабанаў Дзмітрый Іванавіч — першы намеснік начальніка галоўнага эканамічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта	адміністрацыя Савецкага раёна г. Мінска	10:00 — 13:00
5.	Цішчанка Жанна Віктараўна — начальнік галоўнага ўпраўлення па ўзаемаадносінах з органамі заканадаўчай і судовай улады, пытаннях грамадзянства і памілавання	рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (прыёмная грамадзян)	10:00 — 13:00
17 лютага 2017 г.			
6.	Рыжанкоў Максім Уладзіміравіч — першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта	Рагачоўскі райвыканкам	09:00 — 11:30
7.	Міцкевіч Валерый Вацлававіч — намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта	Іўеўскі райвыканкам	11:00 — 13:00
		Лідскі райвыканкам	15:00 — 17:00
8.	Снапкоў Мікалай Генадзевіч — намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта	Бабруйскі гарвыканкам	10:00 — 13:00
9.	Герасімаў Васіль Мікалаевіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Брэсцкай вобласці	Брэсцкі аблвыканкам	09:00 — 12:00
10.	Раўнейка Сяргей Васілевіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Гродзенскай вобласці	Ваўкавыскі райвыканкам	10:00 — 13:00
11.	Ісачанка Анатоль Міхайлавіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Мінскай вобласці	Маладзечанскі райвыканкам	14:00 — 17:00
12.	Лаўранкоў Генадзь Міхайлавіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці	Магілёўскі аблвыканкам	10:00 — 12:00 (прамая лінія) 12:00 — 14:00 (асабісты прыём)
13.	Янчэўскі Усевалад Вячаслававіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення	Барысаўскі райвыканкам	14:00 — 17:00
14.	Мацельскі Андрэй Францавіч — начальнік галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення	Салігорскі райвыканкам	10:00 — 13:00
23 лютага 2017 г.			
15.	Шлык Рыгор Іванавіч — начальнік галоўнага ўпраўлення па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб	Гомельскі аблвыканкам	14:00 — 17:00
24 лютага 2017 г.			
16.	Шлык Рыгор Іванавіч — начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб	Буда-Кашалёўскі райвыканкам	11:00 — 13:00

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў, адміністрацый раёнаў у гарадах.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні дырэктару Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь Іпатаву Вадзіму Дзмітрыевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

АБ РЫНКУ ПРАЦЫ, ПЕНСІЯХ І ДАПАМОГАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны разам з сацыяльнымі партнёрамі былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па сацыяльна адказнай рэструктурызацыі прадпрыемстваў. Калі гаварыць проста, гэта пакрокавае кадравае пераразмеркаванне работнікаў з аднаго прадпрыемства на іншае. «Але, на жаль, далёка не ўсюды гэтыя метадычныя рэкамендацыі працуюць. Магчыма, нам разам з вамі трэба падумаць аб тым, як перайсці на новы ўзровень, замацаваўшы іх заканадаўча», — прапанавала **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Алена МАНКЕВІЧ.**

На калегіі абмяркоўваліся і пытанні распрацоўкі механізму страхавання ад беспрацоўя, а таксама мэтазгоднасць стварэння сістэмы страхавання рызыкі нявыплаты зарплаты пры банкруцтве арганізацый. На думку першага намесніка міністра, станоўчае рашэнне па ўкараненні сістэмы страхавання ад беспрацоўя будзе спрыяць папярэджанню малазабяспечанасці людзей, якія сталі беспрацоўнымі, а таксама павысіць удзел наймальнікаў і работнікаў у папярэджанні беспрацоўя і пераадоленні яго наступстваў.

Адной з задач на 2017-ы ў Мінпрацы і сацабароны называюць утрыманне ўзроўню рэгіструемага беспрацоўя ў межах 2% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Пры гэтым адзначаецца, што, нягледзячы на павелічэнне попыту на працоўную сілу, зніжэнне сярэдняй працягласці беспрацоўя і сярэдняга перыяду працаўладкавання, па-ранейшаму захоўваецца дысбаланс попыту і прапановы на рынку працы і вымушаная няпоўная занятасць. Таму стварэнне новых працоўных месцаў названа як адна з ключавых задач мясцовых органаў улады. У 2017 годзе плануецца працаўладкаваць на зноў створаныя працоўныя месцы 70 тысяч чалавек.

УСЕ ЗВАРОТЫ АБ СТРАХАВЫМ СТАЖЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ РАЗГЛЕДЖАНЫ

У апошнія гады пенсійныя выдаткі складаюць каля 9% ВУП нашай краіны. Цяпер у Беларусі налічваецца больш за 2,5 млн пенсіянераў. Як адзначаюць у Мінпрацы і сацабароны, пенсіі і дапамогі выплачваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме. Забяспечваюцца суадносіны сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй заработнай платы на ўзроўні каля 40%. Гэты паказчык павінен захавацца і ў 2017 годзе.

— Пенсіі залежаць ад стажу і заробку. Памеры працоўных пенсій могуць адрозніваццa больш чым у тры разы. Максімальная пенсія па ўзросце вышэйшая за сацыяльную пенсію практычна ў шэсць разоў. Максімальная пенсія ў непрацуючага пенсіянера па ўзросце можа складаць каля 70% сярэдняй зарплаты ў краіне. Пры налічэнні да пенсіі надбавак і павышэнняў гэтыя суадносіны яшчэ вышэйшыя, — адзначае Андрэй Лабовіч.

За 2016 год сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце склаў 292,22 руб., у тым ліку ў снежні — 305,79 руб. Сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі па ўзросце склаў 213,07 руб., у тым ліку ў снежні — 221,59 руб. Суадносіны мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце і бюджэту пражытачнага мінімуму пенсіянера летась раўняліся 165,3%.

«У мінулым годзе былі прыняты няпростыя, але абсалютна неабходныя рашэнні па павышэнні пенсійнага ўзросту і новых патрабаваннях па страхавым стажы», — лічыць Васіль Жарко. Аднак віцэ-прэм'ер адзначыў, што паступаюць звароты грамадзян адносна страхавога стажу для прызначэння пенсіі, і даручыў разгледзець гэтыя сітуацыі і прыняць разумнае і ўзважанае рашэнне, а пры неабходнасці і скарэктаваць некаторыя моманты.

Акрамя таго, намеснік прэм'ер-міністра запатрабаваў, каб усе ўстановы сацыяльнага абслугоўвання давалі насельніцтву якасныя і запатрабаваныя паслугі. Пры гэтым Васіль Жарко лічыць неабходным узмацніць узаемадзеянне Мінпрацы і сацабароны з Міністэрствам аховы здароўя. Напрыклад, улічваючы тое, што чарговасць пры пасяленні ў дамы-інтэрнаты псіханеўралагічнага профілю яшчэ актуальная ў некаторых рэгіёнах, віцэ-прэм'ер лічыць магчымым размяшчаць людзей, якія маюць патрэбу ў такіх дамах-інтэрнатах, у свабодных будынках ва ўстановах аховы здароўя і адукацыі.

БУДЗЕ ЎЗМОЦНЕНА ПАДТРЫМКА НАЙБОЛЬШ УРАЗЛІВЫХ КАТЭГОРЫЙ СЕМ'ЯЎ

Летась у асобных арганізацыях практычна кожнага рэгіёна была адзначана запазычанасць па выплаце дапамог на дзяцей. Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ў гэтай сітуацыі былі прынятыя аператыўныя меры. У асобных выпадках прымаліся рашэнні аб выплаце дапамог органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Цяпер, па словах Андрэя Лабовіча, запазычанасці па выплаце дапамог няма, надалей гэтае пытанне будзе трымацца на асаблівым кантролі.

Спецыялісты адзначаюць, што летась упершыню быў дасягнуты натуральны прырост насельніцтва, і лічаць вельмі важным захаваць станоўчыя тэндэнцыі нараджальнасці. Для гэтага, як лічыць Андрэй Лабовіч, неабходна падтрымаць самыя ўразлівыя катэгорыі сем'яў, якія не маюць магчымасці ўласнай працай забяспечыць свой дабрабыт. Гэта сем'і з дзецьмі-інвалідамі, а таксама сем'і, дзе самі бацькі з'яўляюцца інвалідамі.

Зараз рыхтуецца да другога чытання ў Палаце прадстаўнікоў праект закона аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Дакумент змяшчае новыя нормы, накіраваныя на ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый грамадзян.

Так, бацькам, якія даглядаюць дзіця-інваліда, плануецца даць права працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці або дома, пры гэтым выплата дапамогі па доглядзе за дзіцем будзе захавана. Прапануецца таксама павысіць памер дапамогі па доглядзе за дзіцем-інвалідам, якому ўстаноўлена трэцяя ці чацвёртая ступень страты здароўя.

Жанчынам, якія атрымліваюць дапамогу па цяжарнасці і родах у мінімальным памеры, прапануецца даваць даплату да памеру дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў за перыяд пасля нараджэння дзіцяці. Таксама мясцовым органам улады будуць прадастаўлены больш шырокія паўнамоцтвы па аказанні сацыяльных паслуг сем'ям з дзецьмі.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Традыцыйныя каштоўнасці

ВЫРАСЦЕ САД, ПАДРАСТУЦЬ І ДЗЕЦІ

Гэтай вясной дэкаратыўныя фруктовыя дрэвы і кустоўе рэдкіх пародаў плануюць высадзіць разам свяшчэннаслужыцелі, урачы, шматдзетныя матулі і жанчыны, якія пагадзіліся ў крызіснай сітуацыі захаваць цяжарнасць. Упрыгожыць плануецца некалькі ўстаноў аховы здароўя і храмаў у кожнай вобласці. У Міністэрстве аховы здароўя спадзяюцца, што першы падобны вопыт стане штогадовым і будзе сімвалізаваць вяртанне да традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.

— Тэматыка прыроднага ўладкавання з'яўляецца для нашага прыхода прыярытэтнай, — кажа **старшыня Сінадальнай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы па пытаннях сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства, настаяцель прыхода храма Свяціцеля Мікалая Японскага ў Мінску протаіерэй Павел СЯРДЗЮК.** — Рэспубліканская акцыя нездарма атрымала назву «Сакуры цвет на зямлі беларускай». Святы раўнаапостальны Мікалай Японскі быў закліканы некалі ў Японію па просьбе першага консула Расійскай імперыі ў Японіі Іосіфа Антонавіча Гашкевіча — выпускніка Мінскай духоўнай семінарыі, ураджэнца Беларусі, які завяршыў свой зямны шлях недалёка ад Астраўца. Дакладнае месца пахавання, на жаль, дагэтуль невядомае. Праз судакрананне з Японіяй мы, можа быць, адкрыем і невядомыя старонкі жыцця сына Беларусі. А пакуль ужо ў лютым будзем нарыхтоўваць пасадачны матэрыял.

Дрэвы і кустоўе прадаставіць Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі, у якім захоўваецца генафонд больш як 12 тысяч найменняў раслін. Дарэчы, сакура, якая адносіцца да групы вішні, таксама там ёсць. Але ў межах акцыі плануецца высадзіць іншыя дрэвы і кустоўе. Гэта можа быць, напрыклад, алыча, вішня лямцавая, айва японская, бружмель сіні, чарнаплодная рабіна, кізіл... «Гэта вельмі важнае ўменне — сузіраць прыгажосць, нікуды не спяшацца, а проста атрымліваць асалоду ад таго, што бачыш, і гэта было б карысна пераняць з Усходу», — заўважае **загадчык лабараторыі інтрадукцыі драўнінных раслін Цэнтральнага батанічнага сада, кандыдат біялагічных навук Ігар ГАРАНОВІЧ.**

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■ Ну і ну!

Адміністратар прысвоіў грошы, каб памірыцца з жонкай

У сталіцы затрыманы раней судзімы 42-гадовы мінчанін, які, працуючы адміністратарам на аўтамыйцы, прысвоіў грошы кліентаў.

— У міліцыю звярнуўся дырэктар адной з аўтамыек, які расказаў, што ў яго адсутнасць на працягу некалькіх дзён з касы былі ўкрадзены грошы — 320 рублёў. Было ўстаноўлена, што іх прысвоіў 42-гадовы адміністратар. Мужчыну затрымалі, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Высветлілася, што, скарыстаўшыся адсутнасцю дырэктара аўтамыйкі, ён вырашыў забраць грошы, атрыманыя ад кліентаў. Іх ён пасля патраціў на сваю жонку, каб памірыцца з ёй: жанчына пастаянна абвінавачвала мужа ў адсутнасці ўвагі і пагражала разводам.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 15.02.2017 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 1 процентный пункт – до 16 процентов годовых, **с 16.03.2017** ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 1 процентный пункт плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также, в соответствии с условиями договора пролонгация вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь, УНП 100693551.

■ Як нас дураць

ГАНДЛЯРЫ ЗОРКАМІ

Беларусам прапануюць купляць назвы нябесных цел

Абяцанне падарыць зорку з неба — класічны прыём з донжуанскага арсенала. І хоць з ажыццяўленнем гэтага на практыцы ёсць некаторыя складанасці, паненкам такая рыторыка даспадобы. Прыемна — ліха яго бяры! — калі дзеля цябе гатовыя на розныя дзівацтвы. Але пры наяўнасці пэўнай сумы грошай нават немагчымае магчыма.

Зоркай, што ззяе за дзясяткі светлавых гадоў, вы не завалодаеце. А вось даць ёй імя на свой густ, аказваецца, не праблема. Заплаціўшы пэўную суму, вы можаце назваць «свабодную» зорку, напрыклад, у гонар каханай дзяўчыны. Такую паслугу прапануе адна са сталічных кампаній. Назва ўносіцца ў «міжнародны зорны каталог», а вы атрымліваеце сертыфікат і карту з указаннем «вашага» нябеснага цела...

Бясконцыя абшары космасу здаўна абуджалі ў чалавецтве не толькі рамантычныя памкненні, але і камерцыйны сверб. Знаходзяцца ўвішныя спадары, што прадаюць дзялянкі зямлі на Месяцы і Марсе. І цікава, што пакупнікі таксама ёсць! Нехта набывае сертыфікаты проста дзеля забаўкі. А іншыя такім чынам робяць «інвестыцыі» на будучыню. Напэўна, у чаканні часу, калі злётаць на Марс будзе, як маршруткай «Мінск—Ждановічы» праехацца. Але ці будзе мець дакумент на марсіянскія ўгоддзі юрыдычную сілу — вялікае пытанне.

Што да куплі зорных назваў, то на сайце кампаніі вас папярэджваюць: права валодання нябесным целам выданы дакумент не дае. А грошы бяруць за ўнясенне абранага вамі «імені» ў каталог. Цана на гэтыя паслугі, трэба сказаць, кусаецца. Назва для самай цьмянай зоркі каштуе 52,5 рубля. З іх 21 рубель — гэта надрукаванне «дакументаў». А самы «пафасны» варыянт палегчыць вашу кішэню ажно на 1365 рублёў! Затое зорку можна будзе пабачыць простым вокам, без тэлескопа. Уражвае і спіс дадатковых паслуг: ад простага ламінавання (6,3 рубля) да стварэння «пашпарта» зоркі з яе гістарычнымі і фізічнымі характарыстыкамі (2100 рублёў). Зрэшты, такія расцэнкі не павінныя пужаць кліента. Бо зорка — гэта вам не цюльпаны ў пераходзе купіць. Гэта сур'ёзная заяўка аб сваіх пачуццях. Мінуць гады і стагоддзі, а імя вашай каханай назаўсёды застанецца ў астранамічным каталозе. Так бы мовіць, у Вечнасці...

Але не спяшайцеся радавацца, атрымаўшы на рукі запаветны сертыфікат. Сваёй вартасцю ён мала чым адрозніваецца ад «дакументаў» на марсіянскія шэсць сотак. Бо абранае вамі імя для зоркі не стане агульнаўжывальным.

— Адзіная арганізацыя, якая мае права даваць назвы нябесным целам, — гэта Міжнародны астранамічны саюз (МАС), — сцвярджае **кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Альгерд КУЗНЕЧЫК, дырэктар абсерваторыі Белдзяржуніверсітэта.** — Прычым толькі малая частка зорак мае ўласныя «імёны», якімі мы карыстаемся ў сілу традыцыі. А ўсе астатнія назвы складаюцца з камбінацый лацінскіх літар і лічбаў, што прысвойваюцца паводле пэўнага алгарытму. І толькі гэтыя найменні, зацверджаныя МАС, ужываюцца астраномамі ва ўсім свеце. Можна весці якія заўгодна «альтэрнатыўныя» каталогі, але навуковай супольнасцю яны нават не разглядаюцца.

Словы беларускага навукоўца пацвярджае і афіцыйны сайт МАС. Цэлы раздзел яго прысвечаны праблеме гандлю зорнымі імёнамі. Зрэшты, для самой арганізацыі праблем ніякіх няма: яна не займаецца камерцыяй. І да «касмічных» дзялкоў не мае ніякага дачынення. Аб чым і папярэджвае далёкіх ад навукі людзей.

За што ў такім разе кліент плаціць грошы? За тое, каб абраную ім назву ўнеслі ў нейкі зорны рэестр, які не прызнаецца навукоўцамі, і выдалі прыгожую паперку. Прычым у махлярстве арганізатараў гэтай бізнес-схемы абвінаваціць цяжка. Каталог ёсць? Ёсць. Якія прэтэнзіі? Дый на сайце кампаніі ёсць пазнака, што да МАС гэты каталог дачынення не мае. Але ж далёка не кожны абывацель разбіраецца ў падобных тонкасцях. А назваць зорку ў гонар блізкага чалавека — прапанова спакуслівая...

Зрэшты, можна абысціся і меншымі выдаткамі. Выбіраеце любую з 30 мільярдаў трыльёнаў зорак, што ёсць у аглядным Сусвеце, заказваеце ў любой паліграфічнай канторы «сертыфікат» — і вуаля! Маеце, па сутнасці, тое ж самае, але без пераплаты. І можаце смела прэзентаваць дарагому вам чалавеку. А калі хто прычэпіцца з пытаннямі, адказвайце, што зорка зарэгістравана ў вашым асабістым каталозе.

Хоць шанц даць зорцы імя, што будзе прызнана ва ўсім свеце, вы маеце. Для гэтага досыць усяго толькі... самастойна адкрыць гэтую зорку! І колькі б ні было нулёў на вашым банкаўскім рахунку, іншых магчымасцяў міжнародная навуковая супольнасць не прадугледжвае.

Валянцін БОЙКА. *boika@zviazda.by*

■ З нагоды

ПАМЯЦЬ І БОЛЬ

У кожнага воіна-інтэрнацыяналіста ёсць рэчы, якія нагадваюць пра афганскія падзеі

У адной з зал Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая расказвае пра пасляваенныя ўзброеныя канфлікты, экспануецца кіцель Віктара Каралёва. Колішні намеснік камандуючага 40-й агульнавайсковай арміі па ўзбраенні, генерал-лейтэнант у адстаўцы — адзін з тых, хто адказваў за вывад войскаў з Афганістана.

На працягу чатырох гадоў воін-інтэрнацыяналіст быў не толькі ў цэнтры афганскіх падзей, а і меў да іх непасрэднае дачыненне — даводзілася распрацоўваць баявыя аперацыі. А двойчы, што называецца, і сам быў паміж жыццём і смерцю. Падчас аблёту ў кастрычніку 1987 года гарнізонаў яго верталёт урэзаўся ў іншы самалёт. На шчасце, намеснік камандуючага абышоўся толькі страсеннем мозга, яго памочнік загінуў... Пашанцавала і тады, калі трапіў пад моцны абстрэл. Напамінам аб тых падзеях для Віктара Каралёва з'яўляюцца два ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу» і... карта, па якой камандуючы 40-й арміі генерал Громаў выводзіў савецкія войскі з Афганістана.

Карту, якая ў свой час лічылася абсалютна сакрэтнай і была бясцэннай для ворага, можна ўбачыць у музеі ў межах часовай экспазіцыі, прымеркаванай да 28-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Тут і ўнікальная калекцыя дзяржаўных узнагарод СССР, Афганістана, юбілейных медалёў і памятных знакаў воінаў-інтэрнацыяналістаў Беларусі, Расіі, Казахстана, Украіны, Літвы і Малдовы, сабраная палкоўнікам у адстаўцы Уладзімірам Шокавым. І серыя карцін інваліда афганскай вайны Юрыя Стасюка, які падчас аперацыі пад Кандагарам атрымаў цяжкае раненне, у выніку чаго амаль страціў зрок. Некалькі агітацыйных лістовак, прадстаўленых на выставе, належаць воіну-інтэрнацыяналісту Ігару Шалудкову. У Афганістан ён трапіў маладым капітанам.

— Для мяне гэта не было нечаканасцю, — прызнаецца падпалкоўнік запасу. — Праз ваюючы Афганістан планавалася прапусціць максімальную колькасць кадравага складу арміі. Папярэдзілі пра гэта дзесьці за паўгода. Так што пра раптоўныя зборы казаць нельга. Можа, і былі адзінкавыя выпадкі, пра якія цяпер пішуць, але я такога не помню. Па-першае, строга сачылі, каб сям'я таго, хто з'язджае ў Афганістан, была забяспечана жылплошчай. Па-другое, усе праходзілі паглыбленую медыцынскую камісію для службы ў краінах з гарачым кліматам. Тых, хто, як кажуць, спрабаваў «закасіць» па здароўі, таксама не ўспомню.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Выстава пабудавана на лёсах тых, хто не па чутках ведае, што такое Афганістан.

У складзе 5-й гвардзейскай мотастралковай дывізіі Ігар Шалудкоў служыў на захадзе Афганістана — прыкрываў іранскую мяжу, але часта ўдзельнічаў у баявых аперацыях і па ўсім поўдні. «Ваяваць з мінімальнымі стратамі навучыліся хутка, — кажа воін-інтэрнацыяналіст. — Людзей бераглі, напралом ніхто не лез. Але вайна ёсць вайна. Больш за ўсё страт было ад падрыву на мінах. Што асабліва страшна, у асноўным гэта была моладзь...»

Служебная камандзіроўка ў Афганістан стала першай і апошняй для Ігара Адамава. На вайну ён трапіў будучы студэнтам 3-га курса Інстытута краін Азіі і Афрыкі. Выходзячы на чарговае баявое заданне, разам з ваенным саветнікам і радыстам ваенны перакладчык трапіў у засаду... Яго маці перадала ў музей трафейную амуніцыю і кабуру, якія належалі сыну, лістоўкі, што засталіся з далёкага 1981-га.

Куратар выставы Міхаіл Паваляеў таксама ўдзельнічаў у баявых дзеяннях у Афганістане. Служыў у разведвальным батальёне. «Акрамя таго, што мы неслі службу на заставах, даводзілася ахоўваць дарогі, аэрадром, трубапровод, — расказвае воін-інтэрнацыяналіст. — Пастаўка паліва адбывалася штодзень. Асабліва асцярожнасць трэба было праяўляць, калі ішла авіяцыйная газа. Яна вельмі выбухованебяспечная, а душманы абстрэльвалі і днём, і ноччу. Страты былі велізарныя...»

Паznаёміцца з лёсамі іншых ветэранаў вайны ў Афганістане праз іх асабістыя рэчы можна па 6 сакавіка ўключна. Дастаткова толькі прад'явіць білет у музей.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■ На слыху

Ісці ў падатковую неабавязкова

Заплаціць збор на фінансаванне дзяржвыдаткаў ці прадставіць «тлумачальную» можна праз інтэрнэт

Грамадзяне, якія атрымалі паведамленне, але не абавязаны плаціць збор (напрыклад, працуюць за мяжой), могуць накіраваць свае даныя ў падатковы орган праз сэрвіс «Электронныя звароты» на сайце Міністэрства па падатках і зборах. Магчыма, гэтага тлумачэння будзе дастаткова, каб ануляваць паведамленне. Дакументы можна таксама даслаць па пошце.

Намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА падчас праграмы «Галоўны эфір» тэлеканала «Беларусь 1» нагадала, што на тое, каб прадставіць у падатковую тлумачэнні, якія сведчаць аб адсутнасці абавязку плаціць збор, даецца 30 дзён з моманту атрымання паведамлення. Калі тэрмін прапушчаны з уважлівых прычын, ён працягваецца яшчэ на месяц на падставе заявы грамадзяніна.

Заявы аб вызваленні ад падатку ў сувязі са складанай жыццёвай сітуацыяй трэба падаваць у мясцовыя выканаўчыя органы. Потым выканкамы апавяшчаюць падатковую аб прынятым рашэнні.

— Асноўнай мэтай Дэкрэта №3 з'яўляецца стымуляванне насельніцтва да працы, і гэта мэта была дасягнута. Многія грамадзяне, якія доўгі перыяд часу не працавалі, сталі звяртацца на біржу, рэгістравацца і шукаць работу. Многія таксама заняліся прадпрымальніцтвам, — адзначыла Святлана Шаўчэнка.

Падатковыя органы накіравалі 470 тысяч паведамленняў на аплату збору. Каля 46 тысяч грамадзян ужо заплацілі яго, у бюджэт паступіла 14 мільёнаў рублёў. Тэрмін аплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год заканчваецца ў наступны панядзелак, 20 лютага. За неаплату ці несвоечасовую аплату прадугледжаны штраф у памеры ад 2 да 4 базавых велічынь ці адміністрацыйны арышт на тэрмін да 15 сутак з абавязковым прыцягненнем да грамадскіх работ.

ЗВЫЧАЙНАЯ АРМЕЙСКАЯ РАБОТА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Усяго за чатыры месяцы стаў кавалерам ордэна Славы, быў узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», потым атрымаў цяжкае раненне, якое выключыла службу ў разведцы. І хоць бацька не любіў расказваць пра ваенныя будні, недзе на ўзроўні падсвядомасці яго прыклад уплываў на светапогляд сына. Карацей, у армію ён прыйшоў па ўласным жаданні пасля праходжання ваеннай кафедры пры БДУ.

Леанід Пятровіч лічыць, што падрыхтоўку ў межах універсітэцкай ваеннай кафедры ён атрымаў даволі добрую. У той час многія з яе выкладчыкаў былі франтавікамі — падпалкоўнікі і палкоўнікі. Яны давалі рэальную базу ў плане навучання артылерыстаў.

Такім чынам, 21-гадовы Леанід Махніст у 1982 годзе паступіў на службу ў даволі вядомую тады 38-ю дэсантна-штурмавую брыгаду, якая дыслацыравалася ў Брэсце. Ну а ў тыя гады практычна ўсе дэсантнікі ў розны час накіроўваліся ў Афганістан. Так, у 56-й дэсантна-штурмавой брыгадзе, якая знаходзілася ў горадзе Гардэзе правінцыі Пакція, прыкладна за 130 кіламетраў ад Кабула, у 1985 годзе з'явіўся новы камандзір узвода старшы лейтэнант Махніст. Больш чым за два гады афганскай камандзіроўкі паспеў паслужыць намеснікам камандзіра батарэі, затым — памочнікам начальніка артылерыі брыгады.

— Што ўжо пра гэта гаварыць, 30 гадоў прайшло, звычайная армейская работа, — адказвае на мае пытанні былы «афганец».

Спрабую не пагадзіцца: мусіць жа не зусім звычайная, калі і сёння без запінкі называецца тэрмін гэтай работы: два гады, два месяцы і 16 дзён, а ў альбоме захаваліся тры календары, дзе кожны з гэтых дзён адзначаны. А яшчэ ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», якія ўпрыгожваюць парадны кіцель, мабыць, былі б і іншыя баявыя ўзнагароды, але прадстаўленні часам губляюцца ў штабных кабінетах, так бывае на вайне...

Пытаюся ў Леаніда Пятровіча, з якім адчуваннем ён глядзіць цяперашнія фільмы, зробленыя на тэму вайны ў Афганістане. Кажа, што яны, мякка кажучы, не натхняюць:

— Там палова, калі не большая, таго, чаго не было насамрэч. Зразумела, што рэжысёрам, каб трымаць гледача, патрэбна рабіць стужку ў стылі баевіка, альбо паказваць абавязкова гераізм і здраду амаль на мяжы фолу. У рэальнасці ўсё недзе складаней, а месцамі — прасцей. Часта наша жыццё там было звычайнымі буднямі, дзе мы стараліся максімальна ўладкаваць свой побыт, імкнуліся падтрымліваць адзін аднаго.

І яшчэ, нягоднікі ёсць заўсёды і ўсюды. Але там не было самаволкі, дзедаўшчыны, рукаприкладства, што сустракаецца ў звычайных армейскіх калектывах, альбо здараліся выпадкі зусім адзінкавыя. Там гэтыя заганы вылечваюцца патрэбай калектывізму як надзейнага спосабу выжывання. А яшчэ мне вельмі пашанцавала з брыгадай, падабраліся надзвычай прыстойныя хлопцы-афіцэры, з якімі было добра служыць. І гэта важна, важней за многае іншае.

Усё, сапраўды, то прасцей, то складаней, чым паказваюць у фільмах. А жыццё, яно само па сабе не простае, — працягвае суразмоўца. — Цяпер часам успамінаю сваіх камандзіраў, тады падпалкоўнікаў. Адзін з іх, генерал-маёр Віталь Анатолевіч Раеўскі, па сутнасці, стварай мабільныя сілы незалежнай Украіны. Яго ўжо, на жаль, няма з намі. Другі — генерал-палкоўнік Валерый Генадзевіч Яўневіч, герой Расіі, быў ваенным прадстаўніком Расіі пры НАТА... Ва ўсіх розныя лёсы, розныя дарогі пасля вайны. Галоўнае, вярнуцца з вайны жывым. А тым, хто вярнуўся, самым важным станавілася ўладкаваць далейшае жыццё.

Гвардыі капітан Махніст пасля вяртання з Афганістана яшчэ служыў у дэсантнай брыгадзе ў Брэсце. А пасля развалу Савецкага Саюза вырашыў звальняцца з арміі і рэалізоўваць сябе па асноўнай грамадзянскай спецыяльнасці. Нейкі час папрацаваў у Брэсцкім філіяле інстытута тэхнічнай кібернетыкі Акадэміі навук, а потым прыйшоў у тэхнічны ўніверсітэт. У графе анкеты «навуковыя інтарэсы» ён звычайна піша: функцыянальны аналіз, дыферэнцыяльныя ўраўненні, тэорыя імавернасцяў, нейронныя сеткі і іх дадаткі. У ваенкамаце яму неяк сказалі, што сярод воінаў-афганцаў ён адзіны матэматык з вучонай ступенню, і не толькі ў Беларусі. Можа, і так. Леанід Пятровіч не правяраў гэтую інфармацыю, але і калег сярод саслужыўцаў-інтэрнацыяналістаў не сустракаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Занятасць

Узровень беспрацоўя вырас

Але гэта традыцыйна для пачатку года

На 1 лютага ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,9 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У параўнанні са студзенем беларусаў без работы стала на 4,6 тысячы больш — усяго 39,9 тысячы.

Калі параўноўваць з тым, што было год таму, то сітуацыя на рынку працы палепшылася. Так, наймальнікамі заяўлена 39,3 тысячы свабодных месцаў: на 42 працэнты больш, чым у лютым мінулага года. Атрымліваецца, што на аднаго беспрацоўнага прыпадае адна вакансія (для параўнання — у лютым 2016-га каэфіцыент напружанасці на рынку быў 1,7). Пры гэтым у асобных рэгіёнах прапаноў больш за саіскальнікаў: у Магілёўскай вобласці прыходзіцца 0,9 беспрацоўных на свабоднае месца, у Гродзенскай — 0,8, у Мінску — 0,6.

Попыт на прадстаўнікоў рабочых прафесій складае 49 працэнтаў ад агульнай колькасці вакансій.

За студзень службамі занятасці было ўладкавана на пастаянную работу 9,5 тысячы чалавек, у тым ліку 7,6 тысячы беспрацоўных. На навучанне па запатрабаваных прафесіях за месяц накіравалі 308 чалавек. Пяці сем'ям аказалі садзейнічанне ў перасяленні на новае месца жыхарства і працы.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

15 лютага 2017 г.
№ 5 (389)

стар. 3

Дарогі расчысцілі за два дні

стар. 6

Хто ўдыхне жыццё ў «мёртвыя» аб'екты?

стар. 8

Эксперыментуем... дзеля ўстойлівага развіцця

ДЭКРЭТ №3

КАГО ЛІЧЫЦЬ УТРЫМАНЦАМ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фотаэкскурсія ў інспектарскі кватэрал.

Карэспандэнт «МС» высвятляла, каго ў Магілёве вызваляюць ад падатку на ўтрыманства

Да 20 лютага грамадзяне, якія пазалетась адпрацавалі менеі за 183 дні, павінны кампенсаваць дзяржаве фінансавыя выдаткі. Гэта дата агаворваецца ў змяненнях да Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», якія ўступілі ў дзеянне сёлета 12 студзеня. Па некаторых даных, толькі ў Магілёве каля 20 тысяч чалавек атрымалі «лісты шчасця». Яны павінны будуць раскашэліцца на 360 новых рублёў. Ігнараваць закон і рабіць выгляд, што гэта паведамленне не дайшло, сабе даражэй. Бо справа будзе перададзена ў суд і можа абярнуцца штрафам ад 2 да 4 базавых велічынь або наогул арыштам на 15 сутак.

ЗАЛОЖНІКІ ЖЫЦЦЁВЫХ АБСТАВІН

Заканчэнне адтэрміноўкі па 2015 годзе прымусіла грамадзян актывізавацца. Усяго ж за перыяд дзеяння дэкрэта ў Магілёўскі гарвыканкам паступіла 667 зваротаў з заявай вызваліць ад збору. З іх на 8 лютага 537 было ўжо разгледжана.

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

Старое жыццё сучаснай вёскі

Ці выйсце — праводзіць аптымізацыю за кошт патрэб сельскага насельніцтва?

Такі выгляд Мажэйкаўская сярэдняя школа набыла падчас ажыццяўлення дзяржаўнай праграмы па адраджэнні сяла.

Я і сёння помню тыя радасныя пачуцці, калі мая родная вёска, што на Лідчыне, трапіла ў дзяржаўную праграму па стварэнні аграгарадкоў. У кароткі час у Мажэйкаве выросла некалькі шматпавярховікаў, з'явілася сучасная амбулаторыя, адчыніліся аптэкі, камбінат бытавых паслуг, пяражыў рэканструкцыю дзіцячы садок, сельскі клуб ператварыўся ў Дом культуры, асартымент у вясковых крамах не саступаў гарадскім універмагам...

А самае галоўнае, поўнасцю змянілася школа. У яе рэканструкцыі прымалі ўдзел ці не ўсе сяльчане. Мы, тады падлеткі, так хацелі першага верасня сесці за новыя парты, што нават на канікулах разграбалі смецце, садзілі клумбы, мылі вокны... І літаральна за тры месяцы, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, у нас з'явілася абсалютна новая школа, дзе не было нават ніводнага старога крэсла. Як цяпер помню, калі на наступнае лета ў школе сустракалі кітайскую дэлегацыю, нам сказалі, што такімі ўмовамі можа пахваліцца не кожная сталічная гімназія.

Мясцовыя жыхары не маглі нарадавацца. Каб набыць неабходную рэч або скарыстацца той ці іншай паслугай, ужо не трэба было ехаць у горад. Пабудаванае жыллё, створаныя працоўныя месцы, а таксама развітая інфраструктура прывабілі і гараджан, якія даўно марылі пераехаць у вёску. У Мажэйкаве з задавальненнем заставаліся пасля размеркавання маладыя спецыялісты. Адным словам, стаўшы аграгарадком, вёска ажыла.

стар. 5

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

КНІГА ЗАПАТРАБАВАНАЯ І Ў ВЕК ГАДЖЭТАЎ

Кніга не губляе сваёй прывабнасці і ў век электронных сродкаў масавай інфармацыі, гаджэтаў, застаецца запатрабаванай чытачамі. Такое меркаванне выказаў на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў 56-га нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», што адбылася ў межах Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмаша, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

Фота БЕЛТА.

Паводле слоў спікера верхняй палаты, выстаўка, на якой прысутнічае такая вялікая колькасць наведвальнікаў, пацвярджае, што кніга была, ёсць і будзе важным элементам у жыцці людзей, а цяга чытачоў да друкаванага выдання не слабее. Гэта крыніца ведаў, наша гісторыя, наша культура. Кніга была і застаецца нацыянальным здабыткам, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

ВІЗІТ СКОНЧАНЫ — ДАМОЎЛЕНАСЦІ ДАСЯГНУТЫ

У мінулы чацвер завяршыўся афіцыйны візіт у Іран беларускай парламенцкай дэлегацыі.

Падчас візіту дэлегацыя наведала інжынерна-даследчую іранскую фармацэўтычную кампанію Tofigh Daru. У ходзе сустрэчы была пацверджана яе гатоўнасць развіваць дзелавыя сувязі з кампаніямі Рэспублікі Беларусь. Бакі абмеркавалі магчымасць лакалізацыі вытворчасці на тэрыторыі нашай краіны як шляхам стварэння сумеснага прадпрыемства, так і за кошт наладжвання супрацоўніцтва паміж фармацэўтычнымі прадпрыемствамі Ірана і Беларусі.

Акрамя таго, беларуская дэлегацыя наведала кампанію «Азхайтэкс» (Тэбрыз), якая з 2009 года з'яўляецца афіцыйным дылерам Мінскага аўтамабільнага завода ў Іране. У 2011 годзе ў гэтай кампаніі адкрыта зборачная вытворчасць аўтамабіляў МАЗ. За перыяд супрацоўніцтва бакоў у Іран было пастаўлена звыш 500 адзінак аўтатэхнікі. А падчас сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з міністрам прамысловасці, шахтаў і гандлю Ірана, якая адбылася напярэдадні, была пацверджана зацікаўленасць Ірана ў далейшым набыцці тэхнікі МАЗ. Члены нашай дэлегацыі азнаёміліся з работай іранскага прадпрыемства, а таксама прынялі ўдзел у адкрыцці лініі па зборцы аўтобусаў.

ПРАДУХІЛІЦЬ НЕБЯСПЕКУ. РАДЫЯЦЫЙНУЮ

У Гомелі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандра ПАПКОВА прайшло выязное пасяджэнне камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Падчас яго парламентарыі абмеркавалі практыку прымянення законаў Рэспублікі Беларусь «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падверглісяradыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

Удзельнікі пасяджэння ўзнялі шэраг пытанняў аб удасканаленні сістэмы радыяцыйнага кантролю і маніторынгу радыеактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя, медыцынскім наглядзе насельніцтва і санаторна-курортным лячэнні дзяцей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, прымяненні ахоўных мер у сельскагаспадарчай галіне, выкарыстанні зямельных і лясных рэсурсаў, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і стварэнні новых вытворчасцяў.

(Больш падрабязна пра гэта чытайце ў наступным нумары «МС».)

ЯК БЫЦЬ З НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНЫМІ?

У мінулую пятніцу ў Магілёве старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ правёў круглы стол аб ролі і месцы інстытута эканамічнай неплацежаздольнасці ў фінансавым аздараўленні прадпрыемстваў.

Удзельнікамі пасяджэння быў разгледжаны ўнесены ў Палату прадстаўнікоў законапраект «Аб неплацежаздольнасці і банкруцтве» і выпрацаваны прапановы па яго ўдасканаленні. У рамках круглага стала парламентарыі наведалі Магілёўскую швейную фірму «Вяснянка» і Магілёўскі завод «Строммашына», якія цяпер праходзяць працэдуру санацыі.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

ЦІ ПАТРЭБНЫ ЎРАЧАМ ПАТЭНТЫ?

Гэту тэму абмяркоўваюць у Палаце прадстаўнікоў

Аказваецца, у пэўных сферах, прынамсі, у медыцынскай, патэнты ўяўляюць сабой не такое простае пытанне. Наяўнасць патэнтаванага спосабу лячэння пэўнага захворвання, безумоўна, робіць канкрэтнага ўрача больш прывабным для пацыентаў. У той жа час іншыя яго калегі з-за гэтага патэнта не маюць права карыстацца адпаведным спосабам, а пакутуюць пацыенты. Калі ж патэнты адмяніць, то можа зменшыцца экспарт медыцынскіх паслуг...

Сітуацыю пракаментавала **Таццяна ЯКУБОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы**. Яна расказала, што сёння дэпутаты камісіі працуюць над праектам закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях патэнтаў на вынаходкі, карысныя мадэлі і прамысловыя ўзоры».

Ужо прайшло пасяджэнне працоўнай групы па гэтым законапраекце, якое, па словах парламентарыя, аказалася вельмі дыскусійным.

— Дэпутат нашай камісіі ўнёс прапанову наконт таго, каб метады аказання медыцынскай дапамогі прызнаваліся патэнтаздольнымі, — тлумачыць Таццяна Якубовіч. — Пад такімі метадамі мы разумеем пратэзаванне, медыцынскую рэабілітацыю. Калі сказаць простай мовай, то патэнтныя вынаходкі ў прамысловасці маюць, як правіла, вельмі сур'ёзны эканамічны эфект. Вынаходнікі атрымліваюць патэнт, потым — ліцэнзію. Безумоўна, пасля яны зарабляюць на гэтым грошы. У медыкаў патэнт не прыносіць камерцыйнай карысці, а з'яўляецца больш маральным фактарам, важным для саіскальнікаў, дактарантаў і аспірантаў...

У якасці прыкладу парламентарый прывяла такую сітуацыю: у нашай краіне шмат хірургаў вельмі высокага класа, якія выконваюць тую ці іншую аперацыю. Ёсць хірургі, якія пэўныя спосабы правядзення пэўнай аперацыі вынайшлі першымі — такія вынаходкі неабходна патэнтаваць. Яшчэ гэта звязана, безумоўна, з экспартам медыцынскіх паслуг. Калі ў рэспубліканскага цэнтра шмат патэнтаў, любы замежнік можа адшукаць інфармацыю пра гэта ў інтэрнэце і адразу выбраць, у якую медыцынскую ўстанову, да якога дакладна ўрача хоча прыехаць лячыцца.

— Мы толькі пачалі працаваць над гэтым законам і ўжо сёння падрыхтавалі пісьмы ва ўсе рэспубліканскія медыцынскія цэнтры, у вышэйшую атэстацыйную камісію Рэспублікі Беларусь, а таксама ў Міністэрства аховы здароўя, каб сур'ёзна прапрацаваць гэтае пытанне, — адзначае дэпутат. — Парламентарыі ж хочуць, каб медыцынскія тэхналогіі былі даступныя для ўсіх. Неабходна зрабіць так, каб патэнты не перашкаджалі ўрачам якасна працаваць і ў той жа час ігралі на руку айчыннаму экспарту.

Сёння Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Еўразійскай патэнтнай канвенцыі, якую падпісалі 8 дзяржаў. Ёсць магчымасць атрымаць адзіны патэнт, які будзе дзейнічаць на тэрыторыі гэтых дзяржаў. У краінах далёкага замежжа нашы патэнты на аказанне медыцынскіх паслуг не дзейнічаюць, хоць нашы суседзі, з якімі мы шчыльна супрацоўнічаем, — Расія і Украіна — іх прызнаюць.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by
Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by
Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

КАМЕНТАРЫІ Ў ТЭМУ:

Таццяна КАВАЛЕЎСКАЯ, начальнік упраўлення права і міжнародных дагавораў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці:

—У 2016 годзе Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці прыняў 521 заяву на выдачу патэнтаў на вынаходку. З іх 65 заявак паступіла ад установ Міністэрства аховы здароўя, прычым 51 заява адносілася да рэгістрацыі новых спосабаў лячэння.

Што такое патэнт? Гэта ахоўны дакумент, які засведчвае выключнае права на вынаходку, аўтарства і прыярытэт вынаходкі перад іншымі распрацоўкамі.

Адно з асноўных прызначэнняў патэнта — гэта камерцыялізацыя вынаходкі. Напрыклад, калі новы метад лячэння акажацца цікавым для выкарыстання, то паміж уладальнікам патэнта і зацікаўленай асобай заключаецца ліцэнзійны дагавор на выкарыстанне вынаходкі, і патэнтаўладальнік атрымлівае грашовую ўзнагароду за тое, што нехта карыстаецца яго вынаходкай.

У той жа час, калі запатэнтаванае наваўвядзенне не выклікае інтарэсу альбо патэнтаўладальнік не выводзіць яго на рынак, адбываецца растрачванне сродкаў, бо ўвесь тэрмін дзеяння патэнта праваўласнік павінен падтрымліваць яго ў сіле шляхам аплаты неабходнай пошліны. Але часта бывае так, што ахоўны дакумент атрымліваюць толькі для абароны навуковай ступені, а потым ён, умоўна кажучы, вісіць на сценцы. Так быць не павінна, бо на афармленне праў на патэнт трэба затраціць каля 400 долараў. Такім чынам, яшчэ да атрымання патэнта, у тым ліку за дзяржаўныя сродкі, трэба разумець, як потым будзе выкарыстоўвацца вынаходка і які прыбытак ад гэтага зможа атрымаць патэнтаўладальнік.

Алег РУМО, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай рабоце 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— Патэнт — гэта аховаздольнасць метадаў лячэння (калі гэта патэнт не на прыладу). Што такое аховаздольнасць? Напрыклад, я вынайшаў пэўны спосаб лячэння, і толькі я ім карыстаюся. А як быць, калі пацыент да мяне ў чаргу не трапіць, ці людзей на прыём занадта шмат, ці раптам чалавека завязуць у іншую бальніцу? Я не дазволю іншай бальніцы рабіць аперацыю, бо ў мяне патэнт на лячэнне сваімі метадамі? Таму даўным-даўно ў Еўропе не патэнтуецца метад лячэння, зыходзячы з этычных нормаў і па шмат якіх іншых фактарах, але галоўны менавіта гэты. А інструкцыя на метад лячэння і аказання дапамогі, якая прымаецца міністэрствам аховы здароўя, дае права выкарыстоўваць гэту методыку ва ўсіх лячэбных установах краіны, такім чынам не выдзяляючы дактароў.

Яшчэ адзін важны момант, што асноўная маса гэтых метадаў вынаходзіцца не «гледзячы ў стол», а за грошы, што выдзяляюцца дзяржавай альбо камітэтам па навуцы і тэхналогіях. Атрымліваецца, дзяржава заплаціла, доктар метад — за кошт чужых сродкаў — стварыў, а пасля яго сабе прысвоіў? Таму сёння прынята рашэнне патэнтаваць новыя метады лячэння пасля зацвярджэння адпаведнай інструкцыі. Што датычыцца ўстройстваў (прылад), то калі ласка — любы доктар можа вынайсці яго і праводзіць лячэнне з яго дапамогай.

СУВЯЗНАЕ ЗВЯНО

Унёсак рэгіёнаў

Як Жодзіна развівае адносіны Беларусі і Пакістана

Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Пакістанам сёння развіваецца паскоранымі тэмпамі. У кастрычніку 2016 года паміж дзяржавамі быў падпісаны пакет дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах, а некалькі тыдняў таму Прэзідэнт заявіў, што да 2020 года ўзаемны тавараабарот можа дасягнуць 1 млрд долараў.

У пачатку лютага дэлегацыя Пакістана на чале са старшынёй Сената парламента Міянам Раза Рабані наведала нашу краіну. У рамках праграмы госці адправіліся ў Жодзіна. Наш карэспандэнт пагутарыў са **старшынёй Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталляй СУШКО** пра вынікі гэтага візіту.

— Наталля Міхайлаўна, якім чынам сёння супрацоўнічаюць Жодзіна і Пакістан?

— Узаемадзеянне з Пакістанам у нас ідзе праз наша горадаўтваральнае прадпрыемства БелАЗ. Яго супрацоўніцтва з будаўнічымі і здабываючымі пакістанскімі кампаніямі пачалося яшчэ ў 1968 годзе. Тады ў Пакістан была адпраўлена буйная партыя нашых самазвалаў — гэта дваццаць шэсць адзінак БелАЗ-540 грузападымальнасцю 27 тон. Гэтыя легендарныя машыны з'яўляюцца папярэднікамі 30-тонных кар'ерных самазвалаў, якія запатрабаваны ў пакістанцаў на сучасным этапе адносін. У 2008 годзе таксама быў здзейснены візіт кіраўніцтва Пакістана на Беларускі аўтамабільны завод, адбылася сустрэча з дырэктарам Пятром Пархомчыкам, дзе бакі спрабавалі знайсці пункты судакранання і абмяркоўвалі далейшае супрацоўніцтва.

Мы працуем сумесна ўжо доўгія гады, але і сёння развіваем нашы адносіны.

— Два тыдні таму парламенцкая дэлегацыя Пакістана наведала БелАЗ. Як сустракалі высокіх гасцей?

— Дэлегацыю мы сустрэлі хлебам і соллю, пасля чаго павялі іх у музей, каб пазнаёміць з падзеямі ў гісторыі нашага галоўнага прадпрыемства. Дарэчы, у 2018 годзе БелАЗу споўніцца 70 гадоў — гэта сур'ёзны юбілей, да якога рыхтуюцца ўсе. Таму мы палічылі неабходным паказаць гасцям усе віды тэхнікі, якія вырабляюць і выраблялі на нашым прадпрыемстве. Дэлегацыю сапраўды здзівіў 450-тонны кар'ерны самазвал БелАЗ-75710, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса. У канцы візіту старшыня Сената парламента Міян Раза Рабані сказаў, што ўсю нашу тэхніку трэба занесці ў Кнігу рэкордаў — настолькі ён быў уражаны. Сам кіраўнік Сената парламента вельмі глыбока ўнікаў ва ўсе аспекты гэтай экскурсіі, пастаянна задаваў пытанні. Пасля гэтага адбыліся перамовы.

— Пра што дамовіліся бакі?

— Спачатку дырэктар Пётр Пархомчык прадставіў інфармацыю аб прадпрыемстве, аб планах і перспектывах кампаніі, а таксама пра тое, якія сёння выпускаюцца мадэлі і якія перадавыя тэхналогіі выкарыстоўваюцца пры іх стварэнні. Асобна мы расказалі і пра горад — пра асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Жодзіна, дэмаграфічную сітуацыю, пра развіццё сацыяльнай інфраструктуры. Таксама членам Сената было цікава даведацца пра арганізацыю работы Савета дэпутатаў базавага ўзроўню і кампетэнцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў. Справа ў тым, што за 2015—2016 гады падпісаны чатыры дакументы аб супрацоўніцтве БелАЗа з Пакістанам, у тым ліку пагадненне аб пастаўцы двух кар'ерных самазвалаў БелАЗ-75135, таму візіт быў хутчэй азнаямленчым, каб дэлегацыя змагла знутры пазнаёміцца з вытворчасцю машын, якія потым запрацуюць на іх кар'ерах.

— Сёння паміж Беларуссю і Пакістанам таксама заключаны шэраг пагадненняў аб узаемным супрацоўніцтве ў сферы адукацыі. У прыватнасці, падпісаны дагавор паміж БНТУ і Лахорскім універсітэтам інжынірынгу і тэхналогій. А Жодзінскі дзяржаўны політэхнічны каледж — філіял БНТУ — працуе з Пакістанам?

— Мы былі б рады, каб студэнтаў нашай навучальнай установы нейкім чынам далучылі да гэтага супрацоўніцтва, і з задавальненнем паказалі б пакістанскім студэнтам нашу матэрыяльна-тэхнічную базу. Магчыма, хто-небудзь выказаў бы жаданне навучацца тут. Мы адкрыты і заўсёды гатовы разгледзець любыя прапановы. Аднак пакуль, наколькі мне вядома, наш політэхнічны каледж не чакае студэнтаў з Пакістана.

— У перспектыве ваш політэхнічны каледж можа дамовіцца аб супрацоўніцтве. Жодзінскія навучэнцы гатовы да вучобы ў незнаёмай дзяржаве?

— Пакуль мы не ведаем, чым пакістанскі бок можа быць прывабным для нас. Але пачынаць зносіны трэба. Няхай пакістанскія студэнты прыедуць у Жодзіна, паглядзяць, як тут праходзіць працэс навучання. Узаемаабмен — гэта таксама вучэнне. Размаўляючы з грамадзянамі іншай дзяржавы, іншага менталітэту і іншай культуры, мы ўсё роўна штосьці для сябе здабываем.

— Каб у Жодзіна пастаянна прыязджалі патэнцыйныя інвестары, трэба быць да гэтага гатовымі. Якія найбольш вострыя праблемы сёння існуюць у горадзе і як яны вырашаюцца?

— Глабальная праблема — гэта тое, што гораду няма куды развівацца. Ён у нас вельмі шчыльна забудаваны, вакол знаходзяцца землі сельскагаспадарчага прызначэння Смалявіцкага раёна. Сёння ў нас ёсць праект дэталёвай планіроўкі і генеральныя планы, па якіх асобныя мікрараёны, калі б гэты дазвол быў атрыманы, маглі б забудоўвацца. Больш за пяць тысяч чалавек у Жодзіне маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, таму для нас вельмі важнае будаўніцтва жылля, а таксама развіццё сацыяльнай інфраструктуры. Адпрацоўка гэтых пытанняў сёння вядзецца на самым высокім узроўні.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

СІТУАЦЫЯ

Дарогі расчысцілі за два дні

Спачатку людзі запанікавалі... Званкі паступалі адзін за адным

Калі ў летні сезон асноўным клопатам сельскага Савета з'яўляецца работа па добраўпарадкаванні тэрыторый, скошванне травы, то зімой на першы план выходзіць стан дарог. Па дарозе нават у аддаленую вёску павінна заўсёды прыйсці аўтакрама, даехаць паштовая машына, не кажучы ўжо пра аўтамабіль хуткай дапамогі альбо іншы спецтранспарт экстранных службаў. Таму дарогі павінны быць расчышчаны заўсёды.

Зразумела, што гэта справа дарожна-будаўнічых арганізацый, але сельскі Савет заўсёды сітуацыю трымае на кантролі, калі трэба, падключаецца. Так, у Хараўскі сельсавет Пружанскага раёна ўваходзіць 20 населеных пунктаў. Некаторыя з іх — Харава, Кабылаўка, Калядзічы — з насельніцтвам пад 600 чалавек, а сем вёсак маюць менш за 15 жыхароў, ёсць і такія, дзе пражывае адзін чалавек. Паміж населенымі пунктамі пралягае больш за 100 кіламетраў дарог, якія трэба трымаць у парадку. На мінулым тыдні нарабіў клопату і страху цыклон «Эрыка», які прынёс у рэгіён моцныя снегапады. За суткі 8-9 лютага выпала месячная норма ападкаў. Дарогі аказаліся засыпаныя снегам.

— Спачатку людзі злёгку запанікавалі, — расказвае **старшыня Хараўскага сельскага Савета Алёна ПСТЫГА.** — Званкі паступалі адзін за адным. Асабліва перажывалі жыхары аддаленых вёсак, пыталіся, як жа ім прывязуць хлеб, іншыя прадукты. Найперш мы стараліся супакоіць людзей, тлумачылі, што адлегласці вялікія, дарожнікі не могуць даехаць да кожнай вёскі адразу, трэба крышачку пачакаць.

Пенсіянерка Любоў ЖАБРУН і старшыня сельскага Савета Алёна ПСТЫГА.

Два дні работнікі Пружанскага ДРБУ-140 працавалі асабліва інтэнсіўна. Ужо 9-га ранкам мне патэлефанавала адзіная жыхарка вёскі Бортнавічы Любоў Максімаўна Жабрун і паведаміла, што да яе хаты дарогу расчысцілі, — працягвае расказ Алёна Рыгораўна. — А вечарам гэтага ж дня я праехала ў бок вёсак Скорцы, Носкі, Залессе, Хвалевічы. Дарэчы, Хвалевічы — адна з самых аддаленых вёсак сельсавета. І паўсюль без цяжкасці прайшла легкавая машына. Дарогі былі не толькі прыбраныя ад снегу, але і пасыпаныя пяском. Так што ўсе гандлёвыя і паштовыя машыны маглі наведаць населеныя пункты.

А ўжо 10 лютага я размаўляла па тэлефоне з прадаўцом аўтакрамы, якая абслугоўвае напрамак у бок Хвалевічаў. Яна паведаміла, што машына гатовая да выезду. Адзінае, за што хвалявалася гандлёвы работнік, каб малако і смятана не падмерзлі, на тэрмометры ў дзевяць раніцы было 16 градусаў марозу.

На тэрыторыі Хараўскага сельсавета дзейнічаюць два сельгаспрадпрыемствы: «АграКалядзічы» і «Айчына». Трэба сказаць, што гаспадаркі дапамагаюць населеным пунктам спраўляцца са снегам, калі яго выпадае асабліва многа. Так, староста вёскі Калядзічы расказаў, што ў вёсцы расчысцілі не толькі праезную частку, але і тратуары.

У такіх і падобных сітуацыях, якія правакуюць капрызы надвор'я, асаблівая ўвага ўдзяляецца тым вяскоўцам, якія маюць статус адзінокіх, а таксама пражываюць адзінока. Такіх па сельсавеце налічваецца 31 і 315 адпаведна. Пра былую даярку Любоў Жабрун ужо згадвалася ў газеце. Жанчына не толькі пражывае адзінока — яна адна на ўсю вёску Бортнавічы. І, як ужо сказана, наступствы снежных заносаў у яе вёсцы ліквідавалі ў першы ж дзень.

Пра адзінокіх людзей зімой, зразумела, трэба клапаціцца больш: ці дастаткова паліва, ці не замярзаюць. Тыя з іх, што становяцца зусім нямоглымі, атрымліваюць накіраванне ў бальніцу сястрынскага догляду. Дарэчы, у Хараве яшчэ ў савецкія часы тагачасны калгас імя Леніна абсталяваў адзіны ў раёне, а можа, і ў вобласці Дом ветэранаў такога кшталту. Адрамантавалі і добраўпарадкавалі пабудову 1960 года, набралі невялікі штат і змяшчалі на зіму адзінокіх ветэранаў калгаснай вытворчасці. Старыя людзі ішлі ў гэты дом ахвотна — бо ён жа знаходзіцца ў сваёй вёсцы, і супрацоўнікі, і суседзі па палатах знаёмыя. А вясной тыя, хто меў сілы, вяртаўся ў родную хату. Для эканамічна моцнага калгаса затраты на ветэранаў не выглядалі вялікімі... Потым развал Саюза, змена кіраўніцтва калгаса, страта гаспадаркай былой моцы — адным словам, сёння той будынак належыць да разраду пустуючых і, хутчэй за ўсё, неўзабаве будзе знесены. Некалькі чалавек з Хараўскага сельсавета цяпер знаходзяцца ў Сухопальскай бальніцы сястрынскага догляду...

Не так даўно сельвыканкаму давялося займацца пахаваннем адзінокага чалавека. І вось на якую акалічнасць звярнула ўвагу кіраўнік мясцовай улады. Цяпер у райцэнтры ёсць і дзяржаўнае, і прыватнае рытуальныя прадпрыемствы. Іх супрацоўнікі па заяўцы выязджаюць нават у самую аддаленую вёску і робяць усё, што патрэбна ў такіх выпадках. А яшчэ некалькі гадоў таму гэта нярэдка станавілася праблемай.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Пружанскі раён.

КАГО ЛІЧЫЦЬ УТРЫМАНЦАМ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

З іх толькі 142 чалавекі атрымалі дазвол не плаціць падатак або кампенсаваць толькі частку яго. Яны змаглі даказаць, што мелі ўважлівыя прычыны не працаваць. Або, як гаворыцца ў законе, трапілі ў цяжкія жыццёвыя абставіны, якія не маглі пераадолець.

— Напрыклад, жанчына не магла працаўладкавацца з-за сваёй цяжарнасці, бо наймальнікі і сапраўды не зацікаўлены ў такіх работніках, — растлумачылі ў фінансавым аддзеле Магілёўскага гарвыканкама. — Паслабленні рабіліся і для тых маладых людзей, якія рыхтаваліся да экзаменаў у вышэйшыя ўстановы адукацыі і паступілі. Ад збору вызваляліся людзі, якія, не маючы групы інваліднасці, пацвердзілі наяўнасць хваробы медыцынскімі дакументамі.

А вось прыклады прычын, якія не лічыліся ўважлівымі. Заплаціць збор прыйдзецца, калі чалавек працаздольнага ўзросту даглядаў бацькоў або проста сваякоў з II—III групай інваліднасці. На думку медыкаў, за такімі хворымі не патрэбны пастаянны догляд, а значыць, гэта не можа быць уважлівай прычынай для вызвалення ад працы. Незадаволенымі засталіся і звароты грамадзян, якія вядуць асацыяльны лад жыцця і стаяць на ўліку ў нарка- і псіханеўралагічных дыспансерах.

ПЕРАДАЛІ ПАЎНАМОЦТВА КАМІСІІ

Апошнія змяненні ў дэкрэт ускладаюць на дэпутатаў місію вырашаць, цяжкае ў чалавека становішча або не. Або, па іх даручэнні, на выканаўчыя і распарадчыя органы. На нядаўняй сесіі Магілёўскага гарсавета былі разгледжаны звароты 54 чалавек, з якіх 22 атрымалі права не плаціць збор цалкам або часткова.

> Пакуль усё ацэньваецца суб'ектыўна кожным членам камісіі. Але павінна быць больш дакладная фармуліроўка таго, што разумеецца пад складанай жыццёвай сітуацыяй.

На думку **старшыні Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Сяргея ІВАНОВА,** большасць з тых, хто звяртаецца па льготы, проста не разумеюць, наколькі ўсё гэта сур'ёзна, спадзяюцца, што атрымаецца пазбегнуць наступстваў. Маўляў, даглядаю старых бацькоў і гэтага дастаткова. Або, напрыклад, жанчына не працавала таму, што сям'і хапала зарплаты мужа. Але адна справа — даць суб'ектыўную ацэнку, і зусім іншая — улічыць меркаванне спецыяліста, і лепей не аднаго, лічыць дэпутат. Ёсць і іншыя абставіны, з-за якіх народным абраннікам гэтай справай, мякка кажучы, цяжка займацца.

— Нашы рашэнні прымаюцца толькі падчас сесій. А сесія склікаецца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз на квартал. Затое камісія гарвыканкама мае магчымасць збірацца кожны тыдзень. І заявы людзей, якія трапілі пад дзеянне Дэкрэта №3, з самага пачатку разглядаліся менавіта на камісіі гарвыканкама, — тлумачыць Сяргей Іваноў. — Але раней яна працавала на падставе артыкула 43 Падатковага кодэкса. У яе склад уваходзяць эканамісты, фінансісты, прадстаўнікі падатковай інспекцыі, РАУС, медыкі і іншыя кампетэнтныя спецыялісты, якім прасцей больш аб'ектыўна ацаніць тую ці іншую сітуацыю. А заадно праверыць, праўду чалавек кажа або не. Чаму мы павінны верыць на слова? Можа, гэты чалавек сёлета дзве машыны прыгнаў, а скардзіцца на цяжкае жыццёвае становішча. Кожны, хто хоча, каб яго вызвалілі ад гэтага збору, павінен пацвердзіць словы дакументальна. І камісія, калі ёсць такая неабходнасць, можа зрабіць запыт у любую інстанцыю. Таму на гэтай сесіі мы і перадалі свае паўнамоцтвы гарвыканкаму.

ДЭПУТАТЫ ПРАПАНУЮЦЬ

Людзі ж працягваюць звяртацца да народных абраннікаў. Не так даўно на прыём да дэпутата Магілёўскага гарсавета Галіны Бяляевай прыйшла жанчына, якая паведаміла, што спачатку не змагла працаўладкавацца па спецыяльнасці, потым была ў дэкрэтным адпачынку, потым занялася дабрачыннасцю. Сям'я жыла небагата, але грошай хапала. Вось жанчына і не спяшалася шукаць працу. Яна зразумела, што зрабіла памылку, і ўжо пайшла працаваць у сацслужбу. Але яе заява наконт збору яшчэ разглядаецца. Разам з прыкладзенымі да яе дакументамі яна перададзена ў камісію гарвыканкама. На погляд Галіны Бяляевай, кожная жыццёвая сітуацыя патрабуе вельмі стараннага аналізу і індывідуальнага падыходу. Трэба быць гібкім у рашэннях. Дзесьці пайсці чалавеку насустрач, а дзесьці заняць больш жорсткую пазіцыю. «Па сваіх дэпутацкіх справах я часта бываю ў дзіцячых садках, — кажа яна. — Не раз прыходзілася чуць пра жанчын-дэкрэтніц, якія адправілі дзіця ў садок, а самі выкарыстоўваюць вольны час для вырашэння сваіх асабістых спраў. Вось у такіх матуль, магчыма, і трэба было б спытацца: чаму дзяржава павінна плаціць вам грошы?»

— Пакуль усё ацэньваецца суб'ектыўна кожным членам камісіі, але павінна быць больш дакладная фармуліроўка таго, што разумеецца пад складанай жыццёвай сітуацыяй, — дадае Сяргей Іваноў. — Сумесна з Магілёўскім гарвыканкамам мы накіравалі шэраг прапаноў у адпаведную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Трэба больш канкрэтна абазначыць, што такое пенсійны ўзрост. Дапрацаваць пункт, дзе гаворка ідзе пра тых, хто даглядае інвалідаў, асабліва калі гэта блізкія родзічы. Удакладніць наконт асоб, якія цалкам выпрацавалі працоўны і страхавы стаж. Трэба ўнесці ўдакладненні ў 200-ы Указ па адміністрацыйных працэдурах, каб чалавек ведаў, якія дакументы павінен прадставіць разам з заявай, а якія запытваць праз службу «аднаго акна». Калі мы атрымаем адказы на ўсе гэтыя пытанні, будзе прасцей прымаць рашэнні.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ПАСТАЯННЫ КЛОПАТ

Пад дахам дома... цішыня



Калі чалавек не даглядае сваё жыллё, яно хутка прыходзіць у запусценне. У вёсцы старыя, пакінутыя дамы становяцца клопатам мясцовай улады. Добраўпарадкаваць тэрыторыю, знайсці спадчыннікаў — гэта толькі частка спраў, якія патрабуюць пастаяннага кантролю. Мы пацікавіліся, як вырашаюць праблему закінутых будынкаў старшыні некаторых сельскіх Саветаў дэпутатаў.

Святлана ГРЭЧКА, старшыня Асавецкага сельскага Савета дэпутатаў Драгічынскага раёна:

— Будынкі, дзе трэці год няма жыхароў, згодна з Указам Прэзідэнта №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці» прызнаюцца старымі. Іх зносяць, а ўчастак зноў уключаецца ў гаспадарчую дзейнасць. Напрыклад, яго можа далучыць да сябе ўладальнік суседняга жылога ўчастка. Для гэтага трэба аформіць заяву, зарэгістраваць землеўладанне і аплаціць патрэбныя падаткі.

Калі ж знайсці новага гаспадара для вызваленай замлі адразу не ўдалося, яна пераходзіць у землезапас. Парадак там падтрымліваецца за кошт сельскага Савета.

Мы стараемся заўсёды ўстанаўліваць спадчыннікаў пустых дамоў. Работу па пошуку распачынаем загадзя, бо без нагляду хутка пагаршаецца стан пабудовы, зарастае прысядзібная тэрыторыя.

Трэба сказаць, што росшук спадчыннікаў — задача не з простых. Даводзіцца праглядаць гаспадарчыя кнігі, дасылаць запыты ў РАУС, натарыяльныя службы, агенцтвы па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Часам знайсці інфармацыю пра ўладальніка маёмасці дапамагаюць аднавяскоўцы, суседзі.

Многія спадчыннікі потым прадаюць дамы, дзе не збіраюцца жыць. Шанц на другога гаспадара звычайна атрымліваюць будынкі да 70-х гадоў пабудовы. Напрыклад, у мінулым годзе было заключана 24 падобныя дагаворы перадачы правоў на пажыццёвае зямельнае ўладанне.

Васіль БАЛАБОСАЎ, старшыня Зарубскага сельскага Савета дэпутатаў Дубровенскага раёна:

— У сельсавеце сёння выяўлена 18 старых дамоў. Кожны год адбываецца знос 3—4 будынкаў за кошт сродкаў сельскага Савета, або спадчыннікі самі разбіраюць сваю маёмасць. Пераважна людзі забіраюць драўніну сабе, а фундамент упарадкоўваем тэхнікай. Працэс выяўлення старых дамоў пастаянны, кожны год спіс такіх участкаў абнаўляецца. Калі цяперашнія землеўласнікі адмовіліся ад участка, ён альбо пераводзіцца ў землезапас, альбо яго набывае сельгаспрадпрыемства і далучае да сваіх плошчаў карыстання. Усё гэта, безумоўна, афармляецца згодна з нарматыўнымі патрабаваннямі.

Уладальніка пустога будынка шукаем праз землеўпарадкавальную службу раёна, апытваем магчымых знаёмых, суседзяў і так, па ланцужку, выходзім на гаспадара. Без яго дазволу стараемся нічога не рабіць, каб потым не здарылася непрыемнасцяў. Знайсці спадчыннікаў насамрэч удаецца рэдка. Мала хто адклікаецца на запыт, ды і часта чалавек з'язджае за мяжу, губляе сувязь са знаёмымі.

Калі пабудова гаспадару не патрэбная, старонні чалавек можа дамовіцца на разбор дома сваімі сіламі. Звычайна такія дамовы адбываюцца без афіцыйнага юрыдычнага афармлення, бо некаторыя будынкі ў сельскай мясцовасці не зарэгістраваныя ў агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры.

Набываць старыя дамы ва ўласнасць у нас жадаючых вельмі мала. Калі раней дачнікі прыязджалі ў вёску, каб заняцца гаспадаркай, агародам, то цяпер людзей у першую чаргу цікавіць адпачынак. Вясковае жыллё купляюць у маляўнічых мясцінах: на беразе возера, побач з лесам. Калі ж адметных краявідаў няма, то, адпаведна, знікае і попыт.

Тамара ЛЯЙКО, старшыня Краснянскага сельскага Савета дэпутатаў Маладзечанскага раёна:

— Мяркую, што галоўнай задачай мясцовых улад павінна стаць памяншэнне колькасці старых дамоў і дамоў, якія пустуюць. У мінулым годзе на тэрыторыі нашага сельсавета было налічана 11 такіх аб'ектаў. Калі ўчастак цягам трох гадоў застаецца незапатрабаваным ва ўласніка, перадаём заяву ў суд для прызнання будынка безгаспадарным. Пасля гэтага спадчыннікам на працягу трох дзён трэба даслаць паведамленне, што яны павінны ўступіць у правы валодання маёмасцю.

Падаецца, было б мэтазгодна скараціць тэрмін чакання, калі дом прызнаецца пустуючым, з трох гадоў да шасці месяцаў. Гэта дапамагло б паменшыць страты на падтрымку добраўпарадкавання. Уявіце, увесь час сельсавет павінен назіраць за будынкам, а пасля высвятляецца, што спадчыннік маёмасць не патрэбная. Калі ж суд зможа прызнаваць дом пустуючым праз шэсць месяцаў, спадчыннік атрымае паведамленне значна раней, і пытанне з будынкам без гаспадара таксама вырашыцца хутчэй. Што датычыцца тэрмінаў рэагавання на судовае паведамленне, то тут, думаю, было б зручна яго павялічыць — не заўсёды абставіны дазваляюць чалавеку зрэагаваць за адведзеныя тры дні.

Яўген НІКІЦІН, старшыня Зябраўскага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна:

— Мы стараемся не даводзіць сітуацыю да зносу. Шукаем гаспадароў, размаўляем з імі, пераконваем. Выпадак, калі спадчыннікі поўнасцю адмовіліся ад маёмасці, быў толькі аднойчы ў мінулым годзе. Тут ужо нічога не зробіш, давялося перадаваць дакументы ў райвыканкам, суд прызнаў будынак пустуючым, было прынята рашэнне аб зносе. Наогул, лічу, што пустуючыя дамы трэба выстаўляць на аўкцыён і шукаць новага ўладальніка, а руйнаваць неабходна толькі жыллё ў зусім неналежным стане. Напрыклад, наш сельскі Савет знаходзіцца недалёка ад абласнога цэнтра, адпаведна, і нерухомасць тут больш запатрабаваная сярод пакупнікоў.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

Старое жыццё...

У аграгарадку знаходзіцца сядзіба XIX стагоддзя. Сёння ў галоўным аб'екце архітэктурнага ансамбля — сядзібным доме — сельскі Савет і бібліятэка.

Гатовы пераплачваць

З таго часу прайшло амаль 12 гадоў. Здавалася, у дзіцячы садок і школку павінна было прыйсці новае пакаленне жыхароў Мажэйкава. Але першакласнікаў з кожным годам становіцца ўсё менш. Моладзь у аграгарадку пабачыш бадай толькі ў летні перыяд — яна збіраецца на бацькоўскіх палетках, каб адпачыць ад гарадской мітусні. Некаторыя, каб мець больш-менш прыстойны заробак, штодзень вымушаны пераадольваць па 60 кіламетраў — менавіта столькі да райцэнтра і назад. Іншыя ж віруюць па мажэйкаўскіх прасторах — ад дома да працы, ад працы да крамы...

Аб тым, што неўзабаве пунктаў на гэтым звыклым для мясцовых жыхароў маршруце можа стаць значна менш, выпадкова даведалася ад бацькоў. З болем у сэрцы яны расказвалі мне (як дачцэ, а не як карэспандэнту рэспубліканскай газеты) пра апошнія навіны. Але журналісцкая неабыякавасць перамагла, і раніцай наступнага дня я выправілася, так бы мовіць, у разведку.

...У краме прамысловых тавараў даволі шматлюдна, нягледзячы на тое, што на календары — нядзеля. Людзі выходзяць са сваіх хат, каб зрабіць неабходныя пакупкі: іншага выйсця няма, бо ў лепшым выпадку большасць з іх у краму трапіць праз тыдзень. Справа ў тым, што працуе яна з дванаццаці да трох дня — якраз тады, калі большасць жыхароў на рабоце. Не ў кожнага ёсць магчымасць выскачыць падчас абедзеннага перапынку. Вось і спяшаюцца па патрэбныя рэчы на выхадных.

За 20 хвілін, пакуль я вывучала асартымент, у краму завітала з дзясятак чалавек. Хто набываў сродкі гігіены, хто — бытавую хімію. Матуля з дачкой-падлеткам забеглі, каб выбраць знаёмай падарунак. Напалову апусцелі паліцы з посудам ды бялізнай, і нават тахта «паехала» ў кватэру вяскоўцаў. А яшчэ летась краму хацелі закрыць!

> Лазня ў зімовы перыяд у аграгарадку ўвогуле зачынена. Для жыхароў прыватнага сектара — праблема не малая.

— Наша прадукцыя карыстаецца попытам у мясцовых жыхароў, — быццам прачытаўшы мае думкі, кажа **загадчыца і прадавец прамысловай крамы Лідзія СТАСЮКЕВІЧ.** — Прычым людзі гатовы плаціць і за надбаўку, якая з-за транспартных выдаткаў уваходзіць у кошт тавару. Нават тыя, хто рэгулярна ездзіць у горад, нярэдка прыходзяць сюды. А што ўжо казаць пра жыхароў, для якіх наша крама — адзіная магчымасць набыць неабходную ў хатняй гаспадарцы рэч.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Як лічыць адна з пакупніц, вяскоўцы сёння абмежаваны ў сваім выбары. «Я сёння набыла б памперсы для ўнучкі, але іх няма, — прызнаецца Ірына. — Таксама скончыўся пральны парашок, але той, які ёсць, мне не падыходзіць».

Сапраўды, асартымент крамы пакідае жадаць лепшага. Праўда, некаторыя тавары можна заказаць па каталогу — і іх сюды даставяць. У прыватнасці, гэта датычыцца мэблі, якую можна набыць з беспрацэнтнай растэрміноўкай. Для вясковага жыхара, які не можа пахваліцца вялікім заробкам, — гэта выйсце. Людзі гатовы заплюшчыць вочы на невялікі асартымент і нават на графік работы прамысловай крамы — галоўнае, каб яна была.

Хварэць — па раскладзе?

Сёння, каб заплаціць за камунальныя паслугі або зрабіць іншыя плацяжы, жыхары Мажэйкава вымушаны адпрошвацца з работы, а насельніцтва іншых вёсак — затрачваць на паход у ашчадную касу ледзь не паўдня. Справа ў тым, што адзіная

Цяпер комплексны прыёмны пункт працуе па іншым графіку...

ашчадкаса працуе толькі тры дні на тыдзень. Адсюль — і вялікая чарга. А між іншым, у аграгарадку сёння пражывае каля 700 жыхароў. І гэта калі не ўлічваць насельніцтва навакольных вёсак, якія адносяцца да Мажэйкаўскага сельсавета.

— Ходзяць чуткі, што ашчадную касу ўвогуле плануюць закрыць, а аплата камунальных паслуг і іншых плацяжоў будзе ажыццяўляцца праз тэрмінал, — расказвае мясцовая жыхарка Алена. — А як жа быць пенсіянерам, якія атрымліваюць пенсію наяўнымі грашыма і ўвогуле не маюць разумення, як абыходзіцца з банкаўскімі карткамі? Ці растлумачыць штосьці тэрмінал, калі раптам у вясковага чалавека ўзнікне пытанне?

Незадаволены жыхары Мажэйкава і графікам работы аптэкі. Набыць лекі тут можна толькі тры разы на тыдзень, і то ў вызначаны час. Вядома, раніцай можна дабрацца да райцэнтра, але і транспарт тут ходзіць не як у горадзе. А што рабіць у выпадку высокай тэмпературы? І ці выручыць уласны аўтамабіль (нагадаю, дарога да райцэнтра — 30 кіламетраў), калі раптам укусіла пчала і тэрмінова неабходны проціалергічны прэпарат?

Карыстальнікаў менш не стала

Лазня ў зімовы перыяд у аграгарадку ўвогуле зачынена. Для жыхароў прыватнага сектара — праблема не малая. Добра, калі ў шматпавярховіках жывуць сваякі або знаёмыя.

Комплексны прыёмны пункт, або Дом быту, як называюць яго вяскоўцы, да нядаўняга часу працаваў у штатным рэжыме. Мясцовыя жыхары рэгулярна прыходзілі да швачкі-майстрыхі: то адрамантаваць паліто, то паправіць у куртцы замочак, то пашыць пасцельную бялізну, набіць на абцасах набойкі... Прызнацца, і я, наведваючы бацькоў, неаднойчы заходзіла сюды: то штаны пакараціць, то сукенку ўшыць. У сталіцы на гэта ніколі не хапае часу, а тут і хутка, і нядорага, а самае галоўнае — якасна і прыгожа.

— Прыйшоўшы да нас па канкрэтную паслугу, чалавек можа набыць і неабходную ў гаспадарцы рэч, — расказвае прыёмшчыца заказаў Ірына Жаўнерчык. — Карыстаюцца попытам і рытуальныя паслугі.

І ўсё было б добра, каб не адно «але». Прыёмшчыцу заказаў, якая тут і прадавец, і швачка, і грузчык у адной асобе, перавялі на паўстаўкі. І гэта пры ўсім тым, што карыстальнікаў паслугамі не становіцца менш.

Аказваецца, камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству па абслугоўванні сельскага насельніцтва «Лідабытсэрвіс», які з'яўляецца ўласнікам комплекснага прыёмнага пункта ў Мажэйкаве, проста нявыгадна ацяпляць памяшканне. У выніку прыёмшчыца працуе ў не зусім прыдатных умовах, паколькі галаўная арганізацыя вымушана была адмовіцца ад цэнтральнага ацяплення.

Аб'яднаць не значыць закрыць

І апошняе. З кожным годам у той прыгожай мажэйкаўскай школцы, пра якую я расказвала напачатку, а таксама ў дзіцячым садку дзяцей становіцца ўсё менш. Вось і перажываюць бацькі, што садок аб'яднаюць са школай.

Такія прыклады ў рэгіёне ўжо ёсць, і гэта нармальная практыка пры недастатковай колькасці выхаванцаў. Але, на думку бацькоў, перавесці дзіцячы садок у школу — не варыянт, бо там няма адпаведных умоў. І яны маюць рацыю. Як дзеці будуць спаць, калі на калідоры падчас перапынку шумяць школьнікі? Ды і званок, які паведамляе аб пачатку і заканчэнні ўрока, часам спрацоўвае мацней, чым будзільнік. А як быць са сталоўкай або прыбіральняй, разлічанымі на больш дарослых дзяцей?

— Што датычыцца аб'яднання навучальных устаноў у аграгарадку Мажэйкаве, на сённяшні час гэта пытанне разглядаецца толькі на тэарэтычным узроўні, — адзначыў **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Лідскага райвыканкама Аляксандр КАДЛУБАЙ.** — На сённяшні дзень у Мажэйкаўскай сярэдняй школе навучаецца менш як 70 вучняў, а ў спісе выхаванцаў дзіцячага садка значыцца каля 20 дзяцей. На будучы год па аб'ектыўных прычынах гэтыя лічбы будуць памяншацца. Вось і ўзнімаецца пытанне аб аб'яднанні ўстаноў у вучэбна-педагагічны комплекс.

Пры гэтым Аляксандр Кадлубай падкрэсліў, што аб закрыцці будынка дзіцячага садка, які быў адноўлены па праграме адраджэння і развіцця сельскіх населеных пунктаў, размова не ідзе. Калі казаць пра аптымізацыю, то тут маецца на ўвазе скарачэнне штатнай колькасці супрацоўнікаў вышэйназваных устаноў.

Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Лідскага райвыканкама паабяцаў, што калі ў рэшце рэшт адбудзецца аб'яднанне, то ў рамках вучэбна-педагагічнага комплексу паспрабуюць знайсці прымяненне кожнаму супрацоўніку.

* * *

У той час як матэрыял рыхтаваўся да друку, у рэдакцыю патэлефанаваў жыхар аграгарадка Гуды, што таксама на Лідчыне. І пачаў расказваць нам пра аналагічныя праблемы свайго населенага пункта.

Відавочна, людзей хвалюе не толькі ўласная будучыня: многія з іх ужо на заслужаным адпачынку, выхавалі і адвучылі дзяцей. Іх сэрцы баляць за лёс вёсак, якія, нават з'яўляючыся аграгарадкамі, маюць патрэбу ў паляпшэнні свайго становішча. Людзі трымаюцца за працоўныя месцы, каб мець хоць невялікі заробак. І па вялікім рахунку, менавіта ад іх залежыць, ці будзе праз некалькі гадоў віраваць у вёсцы жыццё.

Вераніка КАНЮТА.

kanyuta@zviazda.by

Намеснік начальніка аддзела гандлю і паслуг Лідскага райвыканкама Алена УСАНІНА:

— Штогадовае скарачэнне колькасці насельніцтва аграгарадка Мажэйкава (па стане на 1 студзеня 2017 года зарэгістравана 645 жыхароў), зніжэнне пакупной здольнасці значна паўплывалі на падзенне аб'ёмаў выручкі ў краме «Прамтавары» (60—65%), комплексным прыёмным пункце (70—75%), аптэцы (55—60%). Гэта прывяло да нерэнтабельнай работы аб'ектаў, у выніку чаго яны былі пераведзены на скарочаны рэжым работы.

Для задавальнення пакупніцкага попыту ў краме «Прадукты» (рэжым работы: 9.00—21.00) створаны аддзел па рэалізацыі нехарчовых тавараў наступных груп: панчошна-шкарпэткавыя вырабы, тэкстыльныя, галантарэйныя, парфумерна-касметычныя, папярова-белавыя і гаспадарчыя тавары, школьна-пісьмовыя прылады, тавары бытавой хіміі. Акрамя таго, вядзецца прыём папярэдніх заказаў на пастаўку буйнагабарытных тавараў, складанабытавой тэхнікі і мэблі. Асартыментны пералік у крамах выконваецца.

Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 мая 2003 года №724 «Аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі» ў Мажэйкаве сацыяльны стандарт у галіне гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання выконваецца.

КАБ БЫЎ ПАРАДАК

ХТО ЎДЫХНЕ ЖЫЦЦЁ Ў «МЁРТВЫЯ» АБ'ЕКТЫ?

На Міншчыне чакаюць добрасумленных інвестараў

Гаспадыню відаць па тым, як выглядаюць яе дом і падворак. Калі там вэрхал, бруд, то туды і госці не паедуць, і суседзі не завітаюць. Так і ў межах краіны, вобласці, раёна. Пошук новых уласнікаў для будынкаў, якія доўгі час пуставалі, — гэта не самамэта, а жаданне ўлад навесці парадак на зямлі. Таму працэс прыцягнення ў абарот нявыкарыстаных аб'ектаў актывізаваўся ў адносінах да маёмасці ўсіх формаў уласнасці.

Фотаздымак носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Яшчэ нядаўна будынак былой участковай бальніцы ў гарадскім пасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёна, што на Міншчыне, літаральна раздражняў сваім знешнім выглядам мясцовых жыхароў. Ды і перад гасцямі было няёмка. Драўляная пабудова XVIII стагоддзя разбуралася проста на вачах. І вось знайшоўся ўласнік, які ўзяўся ўдыхнуць у будынак другое жыццё. Ды нешта ў яго не зладзілася, магчыма, не хапіла сродкаў, каб ажыццявіць задуму. Будынак быў перапрададзены іншаму прыватнаму інвестару. За адносна кароткі час прадпрыемству «Ніканас» удалося зрабіць тут забаўляльны комплекс, які ўключае кафэ «Новае месца», більярдную, дыскатэку, піцэрыю.

— Нам давялося шмат папрацаваць, каб давесці ўсё да ладу,— расказвае дырэктар установы Мікалай Сямёнаў. — Уладкоўвалі фасады, распрацоўвалі інтэр'ер, добраўпарадкавалі прылеглую тэрыторыю. У найбліжэйшай перспектыве адкрыццё лазні, на трэцім паверсе плануюцца гасцінічныя нумары, а ў двары — дзіцячая пляцоўка. Для таго, каб бацькі змаглі завітаць да нас са сваімі дзеткамі, пакаштаваць нашу кухню, а заадно і пагуляць з малымі.

Сапраўды, у Смілавічах жыве шмат маладых сем'яў, толькі летась тут нарадзілася 102 немаўляці. Дадам, што комплекс працуе з лістапада мінулага года, але ўжо знайшоў сваіх кліентаў. Тут ладзяць карпаратыўныя сустрэчы дарослыя, арганізуюць святы для дзяцей. А работнікі мясцовых арганізацый і прадпрыемстваў заходзяць сюды падсілкавацца. Дарэчы, кошт абеду каля 3 рублёў.

— Я прадпрымальнік з 15-гадовым стажам, — уступае ў размову заснавальніца фірмы Марыя Захаранка. — Акрамя гэтага цэнтра ў мяне ёсць кавярня «Сямёрачка». Вядома, адной з такой гаспадаркай цяжка спраўляцца. Але мне дапамагае сямейная каманда — дачка з зяцем. Лічу, што ў іх нядрэнна атрымліваецца. Спадзяюся, што нашы паслугі будуць усё больш запатрабаваныя ў наведвальнікаў, але ў гэты аб'ект яшчэ шмат трэба ўкласці.

Непадалёку ад «Новага месца» — палацава-паркавы комплекс. Сядзіба належала розным уладальнікам: Кежгайлам, Сапегам, Завішам, Агінскім, Ваньковічам... І кожны з іх уносіў новыя элементы ў яе знешні выгляд. Канчаткова комплекс сфарміраваўся ў XIX — пачатку XX стагоддзя. У 1900-м да старога васьміграннага корпуса быў прыбудаваны новы, у неагатычным стылі з элементамі мадэрну. У 1973-м ён быў перабудаваны. Пры гэтым цалкам страціў першапачатковую планіроўку. У выніку — сапсаваны архітэктура фасада і аконныя праёмы, знішчаны ляпны дэкор, парушаны балконы. На працягу савецкага перыяду будынкі пераходзілі з рук у рукі розных арганізацый. А затым наогул пуставалі больш як 20 гадоў. І, вядома, ператварыліся ў небяспечныя развалiны: іх любілі даследаваць мясцовыя дзеці, навучэнцы каледжа. Для такога кшталту пабудоў, якія з'яўляюцца помнікамі культуры і архітэктуры, заўсёды цяжка знайсці інвестара. Уласнік павінен захаваць першапачатковы выгляд аб'екта, усе дэталі аздаблення і выкарыстоўваць яго па прызначэнні. Інакш кажучы, тут нельга адкрыць вытворчасць, а мецэнацтвам, натуральна, ніхто не хацеў займацца. Аднак у 2014 годзе помнік культуры на аўкцыёне набыла літоўская кампанія «ВИНКТЕХТРЕЙД». Да яе гонару, пачаліся актыўныя аднаўленчыя работы. І ў прынцыпе яна спраўляецца з графікам: ужо адрэстаўраваны адзін з карпусоў, засталася толькі ўнутраная апрацоўка. У другім корпусе расчышчаны падвалы, узведзена сцяна. Прычым рэстаўрацыя ідзе пад кантролем Міністэрства культуры.

А вось будынак былога вучэбна-вытворчага камбіната ў вёсцы Астравы Чэрвеньскага раёна пакуль чакае новага гаспадара. Збудаванне — цаглянае, капітальнае, у добрым стане, вакол добраўпарадкаваная тэрыторыя. Але не шанцуе гэтаму аб'екту: 10 разоў выстаўлялі на продаж, у тым ліку дзевяць разоў з паніжэннем кошту на 20%, пяць разоў — на электронным аўкцыёне.

Каб прадаць будынак вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячага сада-базавай школы ў вёсцы Грабянец, правялі аж 15 аўкцыёнаў. Але да гэтага часу ён не запатрабаваны ў інвестараў...

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

Валянціна ПІВАВАР, старшыня Смілавіцкага сельвыканкама:

— У гарадскім пасёлку Смілавічы застаўся адзін нявыкарыстаны аб'ект, гэта былая школа-інтэрнат, для якой пакуль не знайшоўся інвестар. Над выкарыстаннем пустуючых будынкаў мы працуем разам з Чэрвеньскім райвыканкамам. У мінулым годзе, напрыклад, райспажыўсаюз прадаў будынак, дзе цяпер месціцца магазін «Дабраном». Новы ўласнік адрамантаваў яго, прывёў у належны стан. Пакупнікі задаволены і асартыментам, і абслугоўваннем.

Акрамя таго, сельвыканкам займаецца ўшчыльненнем населеных пунктаў — разам са Смілавічамі іх у нас 18. Шукаем пустуючыя ўчасткі, рыхтуем на іх дакументацыю і выстаўляем на продаж. Частку з іх выдзяляем грамадзянам, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, пераважна гэта шматдзетныя сем'і. Выручаныя ад продажу сродкі ўкладваем у добраўпарадкаванне пасёлка. Летась заасфальтавалі вуліцы Рэвалюцыйную, Меліярацыйную, Першамайскую, пачалі парадкаваць вуліцу імя Максіма Горкага. У планах — будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі, установка малых архітэктурных формаў, уладкаванне тратуараў. Вельмі добра, што ў палацы Ваньковічаў інвестар мяркуе стварыць музей, выставачную залу, адкрыць гасцініцу, каб турыстам было дзе спыніцца. У нас ёсць што паглядзець: музей Манюшкі, Хаіма Суціна і шмат іншага, не менш цікавага. Адноўлены палацава-паркавы комплекс будзе ўключаны ў турыстычны маршрут. Думаю, гасцей, якія цікавяцца гісторыяй Смілавіч, іх ваколіц, значна прыбавіцца.

Святлана ДЗЕГЦЯРЭНКА, дырэктар Мінскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці:

— Большасць прыцягальных аб'ектаў прададзена ў 2011—2014 гадах, у тым ліку і для наладжвання вытворчасці. Гэта былыя вытворчыя базы, аб'екты на тэрыторыі Лагойскага і Смалявіцкага раёнаў, паблізу буйных населеных пунктаў. Цяпер у асноўным засталіся нявыкарыстанымі будынкі сацыяльнай сферы: дзіцячыя сады, школы, сельскія клубы. Яны спецыфічныя ў тым плане, што тут не заўсёды можна размясціць вытворчасць, ды і знаходзяцца далёка ад вялікіх паселішчаў. Але прадаць аб'ект — не самае галоўнае. Важна знайсці сапраўднага гаспадара, які б эфектыўна распараджаўся маёмасцю: адкрыў вытворчасць, кавярню, культурна-забаўляльны цэнтр, аб'ект прыдарожнага сервісу. Усе механізмы ў нас адпрацаваны: спачатку выстаўляем «нічыйны» аб'ект на аўкцыён па рынкавым кошце, калі не знаходзіцца ўласнік — зніжаем цану. Здараецца, маёмасць прадаецца, а пакупнік не заключае дагавор куплі-продажу або не выконвае ўмовы дагавора. У такім выпадку аб'ект вяртаецца ў камунальную ўласнасць. Асабліва характэрная такая сітуацыя для будынкаў, якія набыты пры пачатковай цане ў адну базавую велічыню. Мясцовыя ўлады нядобрасумленных уласнікаў нерухомасці прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці, павялічваюць стаўку падатку на маёмасць і зямлю ў 10 разоў.

Крадуць зямлю

У Столінскім раёне і ваколіцах распаўсюджана спецыфічнае парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства — тут крадуць урадлівы слой зямлі з лясоў і перавозяць глебу на ўласныя цяпліцы.

Як паведаміў **начальнік Столінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Генадзь СЫСА**, у год інспектары выяўляюць да дзясятка парушэнняў, звязаных са знішчэннем урадлівага слою зямлі ў лясных угоддзях. Нярэдка ў іх поле зроку трапляюць жыхары Альшанаў і другіх вёсак, якія такім чынам здабываюць грунт для расады. Так, у Дубайскім лясніцтве Столінскага лясгаса днямі былі затрыманыя двое жыхароў раёна, якія лапатамі знялі ўрадлівы слой глебы на ўчастку плошчай 40 квадратных метраў. Нават мароз і снег не сталі ім перашкодай. Грамадзяне прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Яны мусяць кампенсаваць урон, нанесены прыродзе, у памеры 920 рублёў, а яшчэ ім пагражае штраф да 20 базавых велічынь.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

НУ І НУ!

САМАГОН ЛІЎСЯ РАКОЙ У ЛІК ПАГАШЭННЯ ДАЎГОЎ

Менавіта такі незвычайны спосаб разлічыцца са штрафамі выбраў жыхар вёскі Маліноўшчына Мінскай вобласці.

Як паведамляе Ленінскі РУУС г. Мінска, чые супрацоўнікі праводзілі затрыманне, у прысядзібнай прыбудове, якая была перабсталяваная пад міні-завод па вытворчасці спіртазмяшчальнай вадкасці, праваахоўнікі канфіскавалі больш за 2,5 тысячы літраў брагі і каля 300 літраў гатовага прадукту. Уладальнікам усяго гэтага «багацця» быў 25-гадовы непрацуючы жыхар вёскі, які, дарэчы, сам алкагольныя напоі не ўжывае. Самагонаварэннем мужчына займаўся выключна для атрымання грошай, за што неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Але працягваў гнаць самагон, каб у тым ліку пагашаць раней накладзеныя адміністрацыйныя спагнанні. Вяскоўцу пагражае штраф памерам да 30 базавых велічынь. Дзейнасцю парушальніка зацікавілася і інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Праводзіцца праверка.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

БАЗАВЫ ЎЗРОВЕНЬ

КАМФОРТНЫ ЕЛЬСК

Амаль 170 кіламетраў да абласнога цэнтра, больш за 300 — да беларускай сталіцы і 236 — да ўкраінскай. Вось такое цікавае геаграфічнае становішча. Але нягледзячы на такія адлегласці, жыхары Ельскага раёна не адчуваюць сябе на ўзбочыне цывілізацыі. Працуюць прадпрыемствы, будуюцца новыя дамы, нараджаюцца дзеці... Ёсць, вядома, і свае праблемы. Зрэшты, у каго іх няма? «Пра складанасці і недапрацоўкі трэба гаварыць адкрыта, — мяркуе старшыня Ельскага раённага Савета дэпутатаў, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Сяргей МАТУЗКА. — І не толькі гаварыць, але і дзейнічаць».

— Візітная картка любога рэгіёна — яго эканоміка. У чым адметнасць Ельска з гэтага пункту гледжання?

— Наш горад нездарма мае «хвойную» назву. Бо 66 працэнтаў тэрыторыі Ельшчыны — гэта лясы. І лясная гаспадарка — адзін з «рухавікоў» тутэйшай эканомікі. Нарыхтоўкай і перапрацоўкай драўніны займаецца шэраг прадпрыемстваў — дзяржаўных і прыватных. Развіты ў нашым раёне і агрtoпрамысловы комплекс. У нас 6 буйных гаспадарак, якія спецыялізуюцца на малацэ, мясе, збожжавых, бульбе, кукурузе. Увогуле ў раёне зарэгістравана 255 суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці.

Ёсць прагрэс і ў сферы занятасці насельніцтва. Летась планавалася стварыць у раёне 7 працоўных месцаў за кошт адкрыцця новых прадпрыемстваў, а ў выніку стварылі 35. (А ўсяго ў раёне за 2016 год створана 62 працоўныя месцы.) Прычым новыя прадпрыемствы з'яўляюцца прыватнымі. Гэта пераважна малы бізнес, развіццю якога ўдзяляецца вялікая ўвага.

— Але прыярытэтнай у нас традыцыйна лічылася буйная прамысловасць...

— Буйныя прадпрыемствы па-ранейшаму забяспечваюць масавую занятасць і даюць значныя паступленні ў бюджэт. Але ў вялікага маштабу ёсць і мінусы: трэба болей часу, каб перабудаваць вытворчасць. А малыя прадпрыемствы хутчэй прыстасоўваюцца да зменлівых эканамічных рэалій. Там няма грувасткіх тэхналагічных ліній, якія цяжка пераналадзіць пад новую прадукцыю, запатрабаваную рынкам. Сёння такое прадпрыемства робіць, напрыклад, сталы. Заўтра попыт на іх знікае — і фірма аператыўна пераключаецца на выраб дзвярэй. І ніякіх прастояў. Таму малому бізнесу трэба абавязкова даваць «месца пад сонцам», поруч з вялікімі дзяржаўнымі прадпрыемствамі.

— Як развіццю прыватнага бізнесу можа паспрыяць мясцовы Савет дэпутатаў?

— Асабіста да мяне часта звяртаюцца па пытаннях выдзялення зямлі, афармлення дазволу на забудову і г. д. Стараюся падказаць, параіць, пры патрэбе замовіць слова перад кіраўніцтвам раёна. Бо ад гэтага залежыць агульны дабрабыт. Будуць працоўныя месцы — будзе менш сацыяльнай напружанасці. Будуць падаткі — у раёна будуць грошы на развіццё. Трэба падтрымліваць людзей ініцыятыўных, якія не чакаюць, што ім дзяржава дасць усё бясплатна, а самі «куюць» свой поспех.

— У фірмаў і прадпрымальнікаў, якія толькі нядаўна «адкрыліся», часта ўзнікае праблема з памяшканнямі. Арандаваць іх у прыватнікаў — дорага. У дзяржаўных структур — танней. Але дзяржаўных памяшканняў хапае не на ўсіх ахвотных. А як з гэтым у Ельскім раёне?

— Пасля распаду СССР многія тутэйшыя прадпрыемствы і арганізацыі або закрыліся, або пераехалі аптымізацыю. У выніку павызваляліся і асобныя памяшканні, і цэлыя будынкі. І раён здае іх у арэнду. Больш таго: шэраг будынкаў камерцыйныя арганізацыі могуць купіць. Таму, карыстаючыся магчымасцю, запрашаю ўсіх зацікаўленых звяртацца ў наш Савет дэпутатаў або ў выканкам.

— Але ў эканоміцы раёна, напэўна, ёсць і «болевыя кропкі»?

— Складаную сітуацыю мы маем на кансервавым заводзе і ў «Ельскім аграсэрвісе». Завод спецыялізуецца на вытворчасці гарошку. Але апошнім часам на Палессі надарыліся засухі, і ўзніклі цяжкасці з сыравінай. Хоць па цане прадукцыя была канкурэнтаздольнай. Аналагічныя складанасці і ў «Аграсэрвісу», што вырабляе сланечнікавы і рапсавы алеі. Апошні нават ішоў на экспарт як дадатак да дызельнага паліва. Але праз кліматычныя ўмовы пагоршыліся і ўраджаі рапсу. Таму разглядаецца пытанне аб закупцы сыравіны за межамі раёна, каб «загрузіць» вытворчасць.

— А наколькі развітая ў раёне сацыяльная сфера?

— Магу сказаць, што сам Ельск даволі камфортны для жыцця. Ён узяў усё самае лепшае ад горада і ад вёскі. З аднаго боку, ёсць бальніца, школы, дзіцячыя сады, Дом культуры, магазіны, банкі, рэстаран, некалькі кавярняў, аўта- і чыгуначная станцыі і г. д. Ёсць усе камунальныя выгоды і — што немалаважна для моладзі — хуткасны інтэрнэт. З іншага — можна проста ў горадзе мець агарод, трымаць свойскіх жывёл. А яшчэ цешыцца свежым паветрам і цішынёй, якой не хапае жыхарам мегаполісаў.

Што да праблем, то вельмі актуальнае пытанне рамонту дарог і добраўпарадкавання тэрыторыі ў раёне. А гэта даволі затратныя мерапрыемствы. Грошы выдзяляюцца, але на ўсё адразу іх, вядома, не хапае. Таму штогод Савет дэпутатаў і выканкам выбіраюць населеныя пункты, дзе праблема стаіць найбольш востра, і накіроўваюць асноўныя сродкі туды. Летась мы добраўпарадкавалі вёску Рамязы. Сёлета на чарзе вёска Дзвіжкі. Працэс ідзе, магчыма, не так хутка, як хацелася б, але прагрэс ёсць.

> “Трэба падтрымліваць людзей ініцыятыўных, якія не чакаюць, што ім дзяржава дасць усё бясплатна, а самі «куюць» свой поспех.

— Як дэпутаты мясцовага Савета ўплываюць на сітуацыю? Як наладжана работа з выбаршчыкамі?

— У нас чамусьці склалася так, што гараджане звычайна ідуць са сваімі праблемамі ў выканкам. А да мясцовых дэпутатаў часцей звяртаюцца вяскоўцы. І я асабіста два-тры разы на тыдзень выязджаю ў сельсаветы. Таксама старшыня Савета і дэпутаты прымаюць грамадзян паводле графіка. Людзі звяртаюцца і неафіцыйна, проста спаткаўшы дэпутата на вуліцы. Раён у нас невялікі, усе адзін аднаго ведаюць. І дэпутаты як на далоні: паспрабуй не выканай абяцанне! А для больш эфектыўнай працы ў раённым Савеце ўтвораны 4 пастаянныя камісіі. Яны разглядаюць шырокі спектр пытанняў: ад культуры да сельскай гаспадаркі. Самыя тыповыя — газіфікацыя, водазабеспячэнне, рамонт пад'ездаў, уцяпленне труб у падвалах, усталяванне смеццевых кантэйнераў, асвятленне вуліц, адлоў беспрытульных сабак, стварэнне дзіцячых пляцовак, размяшчэнне дарожных знакаў. А таксама работа транспарту, аховы здароўя і гандлю. Да вырашэння праблем мы прыцягваем і саміх жыхароў раёна. Летась правялі ў населеных пунктах Ельшчыны 138 сходаў грамадзян. Абмяркоўвалі збор сродкаў па самаабкладанні, добраўпарадкаванне тэрыторыі, пажарную і грамадскую бяспеку і г. д. Але грамадзянская актыўнасць людзей пакуль не на самым высокім узроўні. Мы, палешукі, пакуль схільныя сядзець «па хатах» і чакаць, што нехта ўсё зробіць за нас. Хоць ніхто не забараняе жыхарам вёскі сабрацца і, напрыклад, прывесці да ладу могілкі, дзе пахаваны іх жа продкі. І ў гэтым кірунку — развіцця грамадзянскай свядомасці — нам трэба працаваць.

— Ці аказваюць вам дапамогу абласныя і рэспубліканскія прадстаўнічыя органы?

— Так, мы адчуваем падтрымку «зверху». Пры Савеце Рэспублікі працуе Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, членам якога я з'яўляюся. Адна з яго галоўных задач — выкананне рашэнняў Пятага Усебеларускага народнага сходу. Гэта інвестыцыі, інавацыі, экспарт, занятасць насельніцтва і інш. Каб вывучыць усе гэтыя пытанні на практыцы, ладзяцца выязныя пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Дарэчы, адно з іх мае адбыцца на Гомельшчыне. І Ельск сярод гарадоў-прэтэндэнтаў на месца яго правядзення.

— Ці гатовы прыняць дэлегацыю такога высокага ўзроўню?

— Вядома! Нам ёсць што паказаць і чым ганарыцца!

Валянцін БОЙКА.
boika@zviazda.by

ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»,

220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, ком. 201.

Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества

Собрание состоится **21 марта 2017 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.30 до 14.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2016 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2017 год.

2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2016 год.

3. Об утверждении распределения и использования прибыли (убытков) за 2016 год.

4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2017 год.

5. Об избрании членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 1 марта 2017 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 16 марта 2017 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в юридическом управлении ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»

УНП 100135676

«ОАО «Гранд Фэшен Хаус»

17 марта 2017 года в 11.00

проводит очередное общее собрание акционеров по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2016 год и основные направления деятельности общества в 2017 году.
2. Отчет Совета директоров общества.
3. Отчет ревизионной комиссии общества.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности общества за 2016 год.
5. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли общества за 2016 год.
6. Утверждение основных направлений использования чистой прибыли общества в 2017 году и 1-м квартале 2018 года.
7. Избрание членов Совета директоров общества.
8. Избрание членов ревизионной комиссии общества.
9. О размере вознаграждения членам Совета директоров и ревизионной комиссии общества.

Местонахождение ОАО : г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13, с 10 по 17 марта 2017 года с 9.00 до 16.00 либо 17 марта 2017 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания проводится с 10.30 до 10.50 в день и по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 9 марта 2017 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Совет директоров общества

УНП 290671335

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже права на заготовку и закупку виноградной улитки «Helix pomatia» на территории Брестского района

Организатор аукциона	Брестский районный исполнительный комитет, г. Брест, ул. В. Хоружей, 2, тел. (0162) 218899
Сумма задатка, базовых величин / рублей	**10/230**
Начальная цена продажи предмета аукциона, базовых величин / рублей	20/460
Промысловый запас виноградной улитки «Helix pomatia» / предельно допустимый объем изъятия	**10,892 тонн / 8,162 тонн** (в соответствии с заключением Национальной академии наук Беларуси)
Продавец	Брестский районный Совет депутатов
Предмет аукциона	Право на заготовку и закупку виноградной улитки «Helix pomatia» на территории Брестского района

Аукцион состоится 20 марта 2017 г. в 15.00 по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, д. 2 (2-й этаж, зал заседаний).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе (с указанием на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов).
2. Заверенную копию свидетельства о государственной регистрации.
3. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет Брестского районного исполнительного комитета 3641000000334, *филиал №100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, код 150501246, УНП 200044777, ОКПО 04062640*. Срок внесения суммы задатка по 16 марта 2017 г. включительно.

В торгах могут принимать участие юридические лица или индивидуальные предприниматели либо их представители (при условии представления надлежаще оформленной доверенности).

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона оплатить стоимость приобретенного предмета торгов.

Аукцион проводится в порядке, определенном Главой 2[1] Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. №699 «Об утверждении Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства».

Победитель аукциона осуществляет **возмещение затрат на организацию и проведение торгов.**

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, д. 2, каб. 45/2, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 16 марта 2017 года включительно. Контактный телефон: (80162) 218899

ГАЛОЎНАЕ — НЕ БАЯЦЦА,

або Эксперыменты для ўстойлівага развіцця

З лістапада 2013 года да канца 2016-га на Століншчыне дзейнічаў праект ExNet (Сетка агароднікаў Століншчыны), які, аб'яднаўшы вакол сябе ўладальнікаў прысядзібных гаспадарак, дапамог людзям палепшыць тэхналогіі пры вырошчванні агародніны. У рамках праекта быў арганізаваны шэраг эксперыментаў. Каардынатар праекта, дырэктар Столінскага цэнтра падтрымкі сельскага развіцця і прадпрымальніцтва Віктар ВЕЛЯСНІЦКІ адказаў на нашы пытанні.

— Віктар Міхайлавіч, колькі жыхароў раёна было задзейнічана ў праекце?

— Непасрэдна тых, хто ўдзельнічаў у мерапрыемствах праекта (азнаямляльныя паездкі, семінары, эксперыменты, кааператыўныя ініцыятывы), каля 300 чалавек. Але ёсць і тыя, хто ведае аб праекце і хоча карыстацца яго вынікамі, назірае, атрымлівае інфармацыю, але сам не ўдзельнічае ў мерапрыемствах непасрэдна. Такіх людзей каля дзвюх з паловай тысяч. Наша мэта — аб'яднаць як мага больш людзей, якія займаюцца аграбізнесам, каб лягчэй было вырашаць праблемы, што закранаюць амаль кожнага з іх.

> Часам у мяне пытаюцца: якую новую культуру пасадзіць, каб зарабіць? Накіроўваю чалавека ў буйны супермаркет, каб паглядзеў у аддзеле агародніны і садавіны, што прадаецца і па якіх цэнах і што з гэтага можна вырошчваць у нас.

— Нашым суайчыннікам падабаецца эксперыментаваць?

— Не ў такой меры, як хацелася б. Праблема і зараз, нягледзячы на нашу пастаянную і мэтанакіраваную работу, у тым, што многія вельмі асцярожна ставяцца да грантавых сродкаў — а наш праект фінансаваўся Еўрапейскім саюзам. Людзі не зусім разумеюць: як гэта, фінансава падтрымаюць іх ініцыятыву? І гэтыя сродкі не трэба будзе вяртаць? Некаторыя шукаюць «падводныя камяні», але я магу супакоіць тых, хто мае сумненні: у нашай рабоце ўсё празрыста, мы працуем у рамках дзеючага заканадаўства. Таму з кожным годам усё больш жыхароў раёна супрацоўнічае з намі ў рамках розных праектаў. Пачатак кожнага з іх, у тым ліку і гэтага, цяжкі ў плане пошуку актуальных ініцыятыў, таму мы і шукалі агароднікаў-лідараў. Але ў апошні год рэалізацыі праекта людзі ўжо больш валодалі інфармацыяй і звярталіся па падтрымку. Мы дапамагалі і нават цяпер дапамагаем распрацаваць план увасаблення ініцыятывы, які павінен у першую чаргу задавальняць саміх ініцыятараў. Далей зацвярджалі гэтую ініцыятыву разам з планам і выдаткамі на яе рэалізацыю і пасля гэтага ўкаранялі. Але кожны праект пачынаецца і заканчваецца, а дзейнасць нашага цэнтра падтрымкі сельскага развіцця працягваецца, таму мы і цяпер шукаем магчымасці, каб дапамагаць вяскоўцам Столінскага раёна ў рэалізацыі актуальных ініцыятыў.

— І наколькі адчувальнай была дапамога ініцыятыўным людзям?

— Да 80 працэнтаў расходаў на рэалізацыю ініцыятыў выдаткоўвалася са сродкаў праекта. Астатнюю частку сродкаў павінны былі ўкласці самі людзі. Акрамя таго, мы аказвалі і аказваем інфармацыйна-кансультацыйную падтрымку. Нашы спецыялісты дапамагаюць як у тэхналагічных пытаннях, так і ў планаванні аграбізнесу, павышэнні фінансавай адукаванасці. Уладальнікі падсобных гаспадарак, якія хочуць быць прафесіяналамі ў сваёй справе, павінны не толькі ўмець вырошчваць якасную агародніну, але і ўмець выгадна прадаваць яе, лічыць выдаткі і выручку, прыбытак і рэнтабельнасць. Большы прыбытак можна атрымаць не толькі за кошт павелічэння плошчы, ураджайнасці, але і за кошт змяншэння выдаткаў. І гэта важна не толькі ў эканамічным, а і ў экалагічным плане. Людзі ў пагоні за даходамі нясуць вялікія затраты на хімічныя ўгнаенні, сродкі аховы раслін, часта не абгрунтаваныя выдаткі, якія больш шкодзяць, чым прыносяць карысці. Мы гаворым з людзьмі пра тое, што трэба весці аграбізнес так, каб атрымліваць прыбыткі, развівацца, не шкодзіць навакольнаму асяроддзю. Чалавек павінен думаць не толькі пра сёння, а і пра будучыню. У гэтым і ёсць устойлівае развіццё сельскіх тэрыторый: пакінуць зямлю ў добрым стане для нашчадкаў.

— З якімі праблемамі, Віктар Міхайлавіч, давялося сутыкнуцца ў час рэалізацыі праекта?

— Ва ўладальнікаў падсобных гаспадарак малыя ўчасткі зямлі. І калі яны вылучаюць частку свайго надзелу на пэўны эксперымент — апрабаванне новых сартоў, новых угнаенняў, — гэта заўсёды рызыка страты пэўнай часткі даходу, можна застацца без значных сродкаў на ўвесь наступны год. І гэта пры тым, што многія жыхары Століншчыны жывуць практычна з даходаў ад продажу гародніны... Але яны на гэта ішлі.

— Мы больш гаворым пра эксперыменты ў агародніцтве. Але праект прадугледжваў падтрымку і ініцыятыву ў сельскагаспадарчай кааперацыі...

— Кааперацыя невялікіх прыватных гаспадарак — гэта перспектыўны інструмент для павышэння эфектыўнасці аграбізнесу. Члены кааператыва маюць магчымасць купляць насенне, угнаенні, тэхніку не праз другія-трэція рукі, а непасрэдна ў пастаўшчыка. Гэта намнога танней, меншая рызыка набыць няякасны тавар. Гэты ж прынцып і пры рэалізацыі вырашчанай прадукцыі. Калі сфарміраваць вялікі аб'ём прадукцыі для рэалізацыі, то больш шанцаў атрымаць добрую цану і абысці перакупшчыкаў.

У рамках праекта 40 групавых ініцыятыў займелі фінансавую падтрымку для набыцця сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання. Напрыклад, прыходзілі да нас з жаданнем купіць мотаблок. Калі людзі здольныя арганізавацца і супольна карыстацца ім, то быў шанц на падтрымку. За развіццём тых груп, якія здабылі падтрымку са сродкаў праекта, мы сочым і пры неабходнасці дапамагаем кансультацыямі. Калі ёсць прагрэс у развіцці групы, то яна можа і далей разлічваць на нашу дапамогу.

— У межах праекта праходзяць нейкія практычныя заняткі, семінары?

— Так. Скажам, дзень поля — гэта магчымасць перадаць вопыт, завесці новыя карысныя знаёмствы, убачыць вынікі эксперыментаў. Таксама мы прапануем нашым самым актыўным агароднікам выезды на сельскагаспадарчыя выстаўкі і семінары, якія арганізоўваюць вядомыя ў сферы агародніцтва кампаніі. Калі гаварыць пра паездкі за межы краіны, то лічым, што яны вельмі карысныя для нашых людзей, таму што дазваляюць паглядзець і пагаварыць пра перадавыя тэхналогіі, некаторыя з якіх магчыма ўкараняць у нашых умовах. У рамках праекта ExNet адбыліся азнаямляльныя паездкі ў Венгрыю, Польшчу. У гэтых краінах агародніцтва добра развівалася ў мінулым, ды і сёння венгерскія і польскія фермеры не на апошніх ролях у Еўрапейскім саюзе — там ёсць чаму вучыцца.

> Я магу супакоіць тых, хто мае сумненні: у нашай рабоце ўсё празрыста, мы працуем у рамках дзеючага заканадаўства. Таму з кожным годам усё больш жыхароў раёна супрацоўнічае з намі

Але ў любым выпадку нашым людзям трэба думаць самім, які від агародніны вырошчваць, як весці гаспадарку, як развівацца, як вырашчанае найвыгадней прадаваць. А такія арганізацыі, як наша, скіраваны на тое, каб дапамагчы прыняць правільныя рашэнні ў гэтым кірунку. Часам у мяне пытаюцца: якую новую культуру пасадзіць, каб зарабіць? Накіроўваю чалавека ў буйны супермаркет, каб паглядзеў у аддзеле агародніны і садавіны, што прадаецца і па якіх цэнах, што з гэтага можна вырошчваць у нас. Так, дарэчы, нарадзіліся ідэі па вырошчванні кваціstай капусты, брокалі, «пекінкі», перца, так пачаўся і ягадны «бізнес».

Таццяна СЕГЕН.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 14 лютага 2017 года.

■ Псіхалогія для ўсіх

ЭФЕКТ САМАРАЗБУРЭННЯ

Пра што маўчаць булімія з анарэксіяй

Быць правільным і рабіць правільна, ставіць інтарэсы сям'і вышэй за ўласныя — такія патрабаванні бацькоў могуць парушаць здароўе дзяцей, у прыватнасці, харчовыя паводзіны ў выглядзе нервовай анарэксіі і нервовай буліміі.

Любая сям'я павінна, з аднаго боку, перадаваць дзіцяці каштоўнасці і правілы, неабходныя для сацыяльнага ўзаемадзеяння, а з другога — ствараць умовы для развіцця індывідуальнасці. Аднак у рэальным жыцці адны сем'і больш арыентаваныя на соцыум, другія — на асобу. У першым выпадку ў цэнтры ўвагі аказваюцца каштоўнасці і нормы, прынятыя ў грамадстве, адабрэнне і прызнанне пачынаюць атрымліваць тыя якасці дзіцяці, якія будуць забяспечваць паспяховую адаптацыю менавіта ў гэтым грамадстве. У другім жа выпадку асаблівае значэнне маюць эмацыянальныя сувязі паміж членамі сям'і, інтарэсы і патрэбы саміх дарослых і дзяцей, прызнаецца ўнікальнасць кожнага. У ідэале тут павінен быць баланс, а на практыцы...

— Мы даследавалі 95 дзяўчат ва ўзросце каля 19 гадоў з дыягназамі нервовай булімії і нервовай анарэксіі, — расказвае **дацэнт кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, кандыдат псіхалагічных навук Валянціна СЛЯПКОВА.** — Што ж стварае ў сям'і ўмовы для з'яўлення падобных паводзін? Перш за ўсё, дамінаванне каштоўнасці поспеху. Каб і кар'ера, і муж перспектыўны, добрая сям'я, прыгожая і дагледжаная знешнасць. Стварэнне сям'і пачынае ўспрымацца дзяўчатамі як адзін з магчымых спосабаў заняць статуснае становішча. Уяўленні аб здаровым ладзе жыцця зводзяцца да «правільнага харчавання» і выбару адпаведных прадуктаў. Бачыцца неабходным дасягнуць паспяховасці ў розных галінах жыцця адначасова — ствараецца вобраз супержанчыны. Бацькі такіх дзяўчат ігнаруюць іх падлеткавыя патрэбы, не заўважаюць, што тыя становяцца дарослымі і маюць права на аддзяленне, асабістую прастору. У сем'ях, дзе дочкі захварэлі на анарэксію, пануюць кантроль і гіперапека, атмасфера напружаная, хоць знешне дэманструецца згода і гармонія. Канфліктныя, імпульсіўныя, кантралюючыя стасункі характэрныя і для сем'яў, дзе ў дачок развіваецца булімія. Тут пануе эмацыянальная халоднасць і абыякавасць, няма ніякага канструктыўнага спосабу вырашэння цяжкасцяў.

Маніпуляцыі з ежай азначаюць прыняцце свайго, дарослага рашэння. Ствараецца такім чынам адчуванне здольнасці да самакантролю, самадысцыпліны, нараджаецца пачуццё ўласнай годнасці. Кантроль над уласным целам здаецца праяўленнем індывідуальнасці, якой арыентацыя на сацыяльную паспяховасць нанесла непапраўны ўрон

■ Асаблівасці захворвання

ГАЙМАРЫТ... З-ЗА КРОПЛЯЎ?

Насмарк, закладзенасць носа, галаўны боль — кожнаму дзясятаму знаёмы праявы гэтага захворвання

Прастуду многія пераносяць на нагах, бо ўпэўнены, што гэта не такая ўжо і праблема. Падумаеш, пераахалоджванне... Аднак пераахалоджванне вінаватае толькі ў тым, што аслабіла імунітэт, а ў аснове прастуды ў любым выпадку — вірусы. Рынавірусы, каранавірусы, вірусы парагрыпу, іх вельмі шмат. Трапляючы ў арганізм, яны імкліва размнажаюцца, выклікаючы галаўны боль, насмарк, кашаль, боль у горле і павышэнне тэмпературы. Да віруснай інфекцыі нярэдка далучаецца і бактэрыяльная, а гэта пагражае ўжо захворваннямі больш сур'ёзнымі.

Гаймарыт — самы часты вынік прастуды. Унутры пазухі носа пачынаецца запаленне, якое спачатку выклікаюць вірусы, а пасля і бактэрыі. Вось чаму калі насмарк не прайшоў праз 7—10 дзён, неабходна абавязкова паказацца атарыналарынголагу.

— Прычынай гаймарыту ў першую чаргу з'яўляецца вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя, для якой характэрнае запаленне насаглоткі, хваравітае патаўшчэнне слізістай і моцны насмарк. Слізь назапашваецца ў пазухах, і з-за вялікай колькасці бактэрый пачынаецца запаленне, — адзначае **ўрач-атарыналарынголаг 24-й гарадской паліклінікі спецмедаглядаў Любоў ПЯТРОВА.** — Але размова можа ісці і пра ўскладненне алергічнага сінуситу. Пры працяглым кантакце з алергенам запаленне слізістай носа перашкаджае выхаду слізі з пазух. Такі гаймарыт можа напаткаць пераважна восенню і вясной, у самы алергенны час. Узнікае гэта захворванне і з прычыны нялечаных карыёзных зубоў на верхняй сківіцы, на мяжы з гайморавай пазухай.

Западозрыць праблему можна не толькі па традыцыйных прыкметах, але і па моцным сухім кашлі або праблемах з вачамі — ацёках, кан'юнктывіце, знікненні нюху, болі ў зубах, што блізка да носа (крыху вышэй клікоў), цяжары ў галаве. Калі гэта цягнецца больш за два тыдні, а таксама паднімаецца тэмпература звыш 38,5, трэба ісці да лор-урача, які ставіць дыягназ падчас агляду, але для поўнай карціны можа спатрэбіцца і рэнтген. Запушчаны гаймарыт пагражае менінгітам і энцэфалітам, бо гайморавыя пазухі ад галаўнога мозга аддзяляе тонкая касцявая перагародка таўшчынёй 0,5—1 мм.

Сапраўдная прычына гаймарыту — наша няўважлівае стаўленне да свайго здароўя. **З самага пачатку захворвання, пры першых прыкметах насмарку, мы заспакойваем сябе: само пройдзе. Калі стан не паляпшаецца, купляем сасудазвужальныя кроплі (якія так шырока рэкламуюцца!). Яны даюць часовы эфект палёгкі, але выздараўленню не спрыяюць. Знімаючы ацёк за кошт звужэння сасудаў, яны парушаюць самаачышчэнне слізістай і аслабляюць мясцовы імунітэт, бо клеткі імуннай сістэмы дастаўляюцца з крывёй у месца запалення. Так і развіваецца сінусіт або гайморыт.**

Каб гэтага пазбегнуць, тэрмінова звярніцеся да ўрача, калі з вамі адбываецца нешта з ніжэйпералічанага.

- Была прастуда або грып. Вірусы парушаюць работу імунітэту і адчыняюць вароты для бактэрыяльнай інфекцыі.
- Працяглыя, больш за тыдзень, выдзяленні з носа. Яны могуць быць празрыстымі, але калі сталі мутнымі, значыць, далучылася бактэрыяльная інфекцыя.
- Нос моцна закладзены. Лежачы на баку, немагчыма дыхаць носам, нават адной ноздрай.
- З'явіліся слабасць, стомленасць, адсутнічае апетыт.
- Галаўны боль з раніцы, які ўзмацняецца да вечара. Боль у вобласці лба і пераносся пры нахіле наперад. Калі боль захоўваецца ў вертыкальным становішчы, значыць, гаймарыт у вострай стадыі.
- Павышэнне тэмпературы да 38 градусаў.

Галоўная прычына гаймарыту — застой вадкасці — вырашаецца з дапамогай прыродных сродкаў. І толькі калі пры падобнай тэрапіі палёгкі не будзе, урач прызначыць антыбіётыкі. У любым выпадку неабходна памятаць аб проціпаказаннях.

Гаймарыт нярэдка становіцца хранічным у людзей са скрыўленай насавой перагародкай. Дэфект перашкаджае адтоку слізі з пазух і стварае ўмовы для вяртання праблемы. Тады неабходна хірургічнае ўмяшанне.

Хранічным працэс становіцца і пры самалячэнні. Калі пры гаймарыце не аднавіць адток слізі, то не дапамогуць і самыя моцныя антыбактэрыяльныя сродкі. Патрабуецца мясцовае лячэнне — уздзеянне на слізістую і пазухі. Павінны прымяняцца сасудазвужальныя кроплі, супрацьзапаленчыя спрэі, прамыванні носа і пазух, фізіяпрацэдуры

■ Шкода моды

Сем разоў адмерай

Чаму не варта рабіць у роце пірсінг?

Вядома, можна зрабіць пірсінг — праколы вушэй, носа, губ, языка, і не проста пракалоць, а яшчэ і ўпрыгажэнне туды ўставіць. Існуе нават упрыгажэнне зубоў, праўда, гэта ўжо абсалютна іншая працэдура... Ёсць і правілы па падтрымманні пірсінгу ў ротавай поласці, але спачатку трэба ўсё ж такі паразважаць над той рызыкай, якую прынясе з сабой модная забава.

Сёння пірсінг модны, а заўтра нехта пажадае ад яго пазбавіцца, і гэта будзе не так лёгка. Упрыгажэнне зняць не цяжка, а вось пашкоджаныя тканкі могуць не зарасці — тут вам і хранічнае запаленне. Акрамя таго, падчас зарастання ўтворыцца непрыгожы рубец. Калі сказаць коратка, то ўпрыгожваць цела праколамі — занятак шкодны. Здаровым і прыгожым наша цела робяць толькі здаровы лад жыцця і спорт.

— Пры пірсінгу магчыма і заражэнне інфекцыямі, і пашкоджанне сасудаў, нерваў, зубоў, — тлумачыць **урач стаматолаг-тэрапеўт 1-й катэгорыі 9-й стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Марыя АЛЕЙНІК.** — Асабліва небяспечны пірсінг языка і губ: ён можа прывесці да страты зубоў. Нават непрацяглае нашэнне нейкага ўпрыгажэння значна дэфармуе тканку дзясны, што не заўсёды паддаецца хірургічнаму лячэнню. Пашкоджанне адбываецца з-за пастаяннага кантакту дзясны і ўпрыгажэння. Узнікаюць праблемы з дзясной, скол зуба, пашкоджваецца і ўзнікае запаленне нерва, тканак перыядонту, што цягне за сабой выпадзенне зубоў, боль, напуханне, інфекцыі, павелічэнне колькасці сліны, слінацячэнне, страту смаку, расшчапленне або шчыліны ў зубах, цяжкае кровацячэнне, напуханне языка, праблемы падчас праверкі зубоў і правядзення рэнтгену зубоў. Пастаянная траўматызацыя — гэта яшчэ і павелічэнне анкалагічнай рызыкі.

Інфекцыя пагражае не толькі з-за пашкоджання, але і з-за вялікай колькасці бактэрый у роце. Рызыка ўзрастае і ад дотыку да месца або ювелірнага вырабу бруднымі рукамі, ужывання бруднай ежы або вадкасці і кантакту з нейкімі прадметамі. Пірсінг — гэта і перадача тых інфекцый, што перадаюцца праз кроў, такіх як ВІЧ і гепатыты

■ Правілы эксплуатацыі

ПАШКАДУЙЦЕ «ФІЛЬТРЫ»

Як часта мы то прастуду на нагах пераносім, то на халодным сядзім, то карыесныя зубы не лечым, а нашы ныркі-фільтры тым часам ад усяго гэтага пакутуюць.

— Следам за лёгкай прастудай або карыесам можа з'явіцца боль у паясніцы, адчуванне застою ў ёй пасля сну, невялікае павышэнне тэмпературы пад канец працоўнага дня, — расказвае **загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення №2 11-й гарадской паліклінікі Мінска Вольга ЯЧЭЙКА.** — Даволі хутка мы нібыта вяртаемся ў норму — папілі модны аспірын і зноў сталі бадзёрымі, але ўнутры нырак тым часам з'явілася бацыла, якая пачала ўжо зніжаць эфектыўнасць іх работы і чакаць удалага моманту для сапраўднага наступлення. Яна размнажаецца, і вось ужо клапаны мачаточнікаў не могуць шчыльна прыкрывацца, і ў ныркі пачынаюць трапляць бацылы з выдзяляльных шляхоў. Розныя ныркавыя захворванні сустракаюцца і ў дарослых, і ў дзяцей. Асабліва ў групе рызыкі жанчыны — з-за анатамічных асаблівасцяў.

Што спрыяе хваробам нырак?

Няправільнае харчаванне. Ныркі пакутуюць ад лішку бялку, цукру, солі, алкаголю. Бялок не здольны назапашвацца ў арганізме, а значыць, павінен з яго выводзіцца. Нагрузка на ныркі пры гэтым павялічваецца. Калі ім не ўдаецца вывесці бялок да канца, пачынаюць утварацца ўратныя камяні. Лішак салёнага і салодкага парушае водна-салявы баланс. Праўда, поўная адмова ад ужывання солі гэтаксама прыводзіць да ныркавай недастатковасці. Ідэальна проста недасольваць стравы, бо соль ёсць у многіх прадуктах, у тым ліку салодкіх.

Рэзкае зніжэнне вагі. Гэта пазбаўляе нашы ныркі натуральнай абароны ў выглядзе тлушчавых капсул. Што да алкаголю, то, вядома, што ім даводзіцца не толькі расшчапляць яго, але і выводзіць. Акрамя таго, алкаголь абязводжвае арганізм — спачатку ён імкнецца як мага хутчэй пазбавіцца атруты і аддае для гэтага ўсе водныя запасы. Далей кроў згусае, і ачышчаць яе становіцца значна цяжэй.

Перапоўнены мачавы пузыр. Калі мы выпіваем дастатковую колькасць вадкасці, то ходзім у прыбіральню 4—6 разоў за суткі. Калі радзей, ёсць над чым падумаць. Нельга і трываць да апошняга, бо калі мачавы пузыр перапоўнены, частка вадкасці можа трапляць па мачаточніках назад у ныркі, і гэта ім шкодзіць. Што да запораў, то яны атручваюць арганізм тымі прадуктамі распаду, што ёсць у калавых масах.

Холад і спёка. Прычынай хранічных захворванняў нырак можа незаўважна стаць пераахалоджванне. Аднак і моцная спёка, інтэнсіўнае потааддзяленне таксама дрэнна адбіваюцца на гэтым органе, асабліва пры дэфіцыце вады.

Стомленасць, перагрузкі. Калі арганізм аслаблены, любая інфекцыя можа не сустрэць адпаведнага супраціўлення і з кроўю спакойна трапіць у ныркі. Калі ж там яна сустрэне «бацылу-калегу», пра якую мы казалі вышэй, то разам яны наваробяць шмат нядобрага.

Недалечаныя захворванні. Звычайны карыес, які з'яўляецца пастаўшчыком ядаў, бацыл і таксінаў у кроў, прымусіць нашы фільтры працаваць ва ўзмоцненым рэжыме, каб пазбавіць усяго гэтага

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентных ставок по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

С 15.03.2017 устанавливается по ранее открытым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:

- **«Премиально-накопительный «Детский»**, открытым до 13.11.2015, ставка основных процентов в размере 13,5% годовых;

- **Накопительный** (накопительный вклад в национальной валюте с ежемесячной капитализацией; накопительный вклад в белорусских рублях; срочный банковский накопительный вклад в белорусских рублях, а также накопительные вклады, введенные согласно Приказу Государственного банка СССР от 29.03.1990 №30 «О введении новых видов вкладов в учреждениях Сберегательного банка СССР») процентная ставка в размере 13,5% годовых.

Установленный размер процентов применяется только к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность и автоматическое перезаключение которых на новый срок произошло до 01.04.2016.

С 15.03.2017 устанавливается по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях **«Интернет-депозит-Тренд»**:

- со сроком хранения 24 и 36 месяцев, открытым до 05.05.2015, ставка основных процентов при фактическом ежедневном остатке вклада:

до 2000,00 рубля (включительно) – в размере 13,5% годовых;

свыше 2000,00 рубля – в размере 14% годовых;

- со сроком хранения 12 месяцев, открытым до 01.04.2016, процентная ставка при фактическом ежедневном остатке вклада:

до 2000,00 рубля (включительно) – в размере 12,5% годовых;

свыше 2000,00 рубля – в размере 13% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

С 15.03.2017 устанавливаются по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях, открытым до 15.02.2017, процентные ставки в следующих размерах:

- **«Классик Отзывный до года»:**
на срок 185 дней – 7,5% годовых.
- **«Классик Безотзывный до года»:**
на срок 6 месяцев – 11% годовых;
на срок 9 месяцев –13,5% годовых.
- **«Свободный выбор»**:
на срок 11 месяцев – 15% годовых;
на срок 24 месяца – 17% годовых.
- **«Классик Безотзывный свыше года»**:
на срок 18 месяцев – 16,5% годовых;
на срок 24 месяца – 17% годовых.
- **«Интернет-депозит-Тренд Отзывный»**:
на срок 1 месяц – 7,5% годовых;
на срок 3 месяца – 9% годовых;
на срок 6 месяцев – 13% годовых;
на срок 9 месяцев – 13,5% годовых.
- **«Интернет-депозит-Тренд Безотзывный»**:
на срок 1 месяц – 9% годовых;
на срок 3 месяца – 11% годовых;
на срок 6 месяцев – 14% годовых;
на срок 9 месяцев – 15% годовых.
- **«Классик Почтовый Отзывный»** – 13% годовых.
- **«Классик Почтовый Безотзывный»** – 16% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь, УНП 100325912.

